Содержание

1. - Содержание -
2. Chapter 1
3. Глава 1: Цяжар
4. Глава 2: Жонка
5. Глава 3: Разьвітаньне
6. Глава 4: Адна
7. Глава 5: Сьвечачка
8. Глава 6: Дом
9. Глава 7: Начны госьць
10. Глава 8: Цемра
11. Глава 9: Айцец
12. Глава 10: Жонка
13. Глава 11: Брат
14. Глава 12: Сойм
15. Глава 13: Сястра
16. Глава 14: Непаразуменьне
17. Глава 15: Ноч
18. Глава 16: Луцк
19. Глава 17: Дамоў
20. Глава 18: Жонка
21. Глава 19: Вясельле
22. Глава 20: Мадонна
23. Глава 21: Пачатак
24. Глава 22: Ашмена
25. Глава 23: Полымя

- Чужынец ты.

Багдан зь нянавісьцю глянуў на яго. Халодная, колкая, яна плёскалася ў яго сьветлых вачах, як вада ў палонцы, пералівалася цераз край, гусьцела ільдзінкамі недаверу, абурэньня, агіды, застывала даўняй крыўдай, ствараючы вакол крохкія берагі, сьмяротныя, небясьпечныя. Не падступішся без таго, каб не абламіць гэты кволы лёд, і не ўхнуць у ледзяную нянавісьць, сьмяротную пастку - з галавой,назаўсёды, каб ужо ніколі ня выбрацца зь яе, ня выратавацца, і так і пайсьці на дно чорнага віру міжусобнае бойкі.

- Які я табе чужынец? Што ты кажаш?

Ён цяжка паўстаў з-за дубовага сталу, прайшоў па пакоі. Адкінуў з ілбу пасму густых валасоў. Калісьці чорныя, цяпер яны сталі амаль сівымі. Соль зь перцам. Ці, як Млечны шлях - срэбная паласа ў густым чорным небе, дзе-нідзе ўтыканым мірготкімі цвічкамі зорак. Ноч прасыпала скарб - манеты пакаціліся, і срэбрам апалі на яго галаву. Гэтай узнагароды ён не прасіў, яна сама прыйшла, нечакана, як восеньскае лісьце нечакана пачынае ападаць, абцяжаранае золатам, як прыходзіць на зьмену дзяцінству юнацтва, на зьмену яму - сталасьць, і на зьмену ёй - сьмерць. Адвечнасьць. Пакой. Адпачынак. Часам яму здавалася, ён аб ім марыць, чакае. Ды адпачынак усё неяк адкладваўся. То адно, то другое. Вось і цяпер - Вітаўт ня вытрымаў цяжару жыцьця, памёр. Зваліўся вялікі дуб, і зь яго пахіснуўшыхся галін узьвілася ў гару вараньнё. Хцівыя, прагныя крыкі раздаюцца вакол. Крычаць, дзеляць. Дзеляць уладу, багацьці, землі, мітусяцца, згубіўшы напрамак, куды ляцець, да каго прыбіцца? Ляжыць важак нерухома, сьпіць у каменным гробе. Што яму цяпер гэтыя свары зграі, крык, гвалт і мітусьня? Доля мёртвых - паважны спакой, велічны сон, авеяны покрывам лягендаў ды песень, казак.

Але ж яны - жывыя. Пакуль.

- Які я табе чужынец? - вымавіў. - Я ж тут жыў з табой, усё жыцьцё на адной зямлі. Тут я сталеў, тут нарадзіўся і памёр мой бацька, продкі мае тут пахаваныя, курганы паўсюль.

Што і калі я зрабіў, каб мяне звалі - чужынец? Ці здрадзіў я гэтай зямлі, ці аддаў яе ворагу? Ці прадаў, ці разрабаваў? Яна была пустазельлем, пакуль я ня ўзяўся за яе. А цяпер гэта - годнае месца, вядомае паўсюль, і знаць вышэйшых еўрапейскіх дамоў ведае яе і не пагарджае нашым сяброўствам. Мы адкрылі шырокі шлях на захад, на поўдзень і поўнач, ляглі ад мора і да мора, праз нас ідуць караваны, нам паціскаюць руку манархі і каралі ад Італіі да франкаў, германцаў, і нават далёка за морам ведаюць нас. Дзе ж тут была здрада, скажы? Што яшчэ было нам патрэбна зрабіць, каб замест зьнявагі ды крывых вусьмешак дома атрымаць шчырую падзяку і братэрскую руку - ад брата? Ад свайго? Бо ж сусед нам апынуўся больш братом, чым свая ўласная кроў.

- Ня пэцкай нашую кроў сваім брудным словам.

Вочы суразмоўцы наліліся, набрынялі крывёю.

- Мы - русіны, мы - людзі праваслаўнае веры. А ты - ліцьвін. Паганец. Чортава племя, прыцягнуўшае ў наш край лацінскіх папоў і рымскі хамут. Мы хочам волі. І мы яе атрымаем. Там, на ўсходзе, на поўдні, дастаткова сабралася моцы, каб вас паціснуць. Толькі з братамі разам. Не з вамі, прадажнымі, апранутымі ў бясоўскія адзеньні, запляміўшымі родную зямлю гэтымі косткамі, якія вы клічаце храмамі.

Мы адбудуем сваю краіну - вольную. Разам з тымі, хто нам браты па веры.

Багдан цяжка дыхаў, гледзячы на яго.

Ён стаяў, апусьціўшы вочы. Слухаў. Глядзеў глыбока ў сябе.

- Волі? - раптам ён узьняў галаву.

- Волі ты не атрымаеш. І не праз мяне ці лацінскія кайданы.

Бо там, куды глядзіш, волі яшчэ меней. Там яе наогул няма.

Паміж імі павісла халодная, мёртвая цішыня.

- Паглядзем. Багдан устаў, камячучы ў руках дарагое футра. Кінуў раптам шапку аб сьцяну - так, што аграф адляцеў і асыпаў дыямантавымі ды рубінавымі іскрамі падлогу, і выйшаў, не аглядваючыся. Кроплі чырвоных каменьчыкаў пакаціліся, заблішчэлі па чорных дубовых дошках, быццам кроў.

- Першая кроў пралілася, - падумалася яму. Яго рука звыкла лягла на наверша ў ножнах на сьцягне.

На памяць прыйшоў зьезд - той, у Луцку.

Тады яны сабраліся па ўрачыстай нагодзе: наканаваная каранацыя Вялікага Князя мела месца адбыцца ў прысутнасьці высачэйшых асобаў, уладароў буйных краін регіёну, якія атачалі Княства Літоўскае. Акрамя мясцовых радоў і палякаў на чале зь Ягайлай, угорцаў, харватаў, аўстрыйцаў прыехалі і прадстаўнікі здалёк, з Візантыі і Рыму, Даніі, тэўтонаў, лівонцаў. На некалькі дзён спазьніўшыся, прыехаў сам Жыгімонт з жонкай і сьвітай. Папа Рымскі прыслаў легата, ад русінаў - аж тры вялікія князі - Масквы, Разані, Твяры, а таксама шэраг татарскіх ханаў.

Вітаўт быў за гаспадара - пачэсная роля. Месцам збора быў абраны Луцк на Валыні, дзе толькі што князь завяршыў

будаваньне велічнага фарпосту - замку Любарта, які вылучаўся высачэзнай Гаспадарскай Вежай, і быў створаны па ўсіх правілах старажытных рымскіх кастэляў: мур, ахопліваючы вялізны кавалак зямлі, з вартавымі і абароньчымі вежамі, здольны трымаць доўгую і адчайную аблогу. За гады праўленьня Вітаўт пашырыў і дабудаваў шэраг абароньчых замкаў, ахопліваючых шэра-чырвоным поясам заходнія рубяжы краіны, закладзеных яшчэ ў часы Гедыміна як абарона ад нападаў тэўтонскіх крыжакаў. Замкі горда ўзьнімалі свае магутныя вежы, ахоўваючы Літву, сьцьвярджаючы права на яе яе ўласнага народу - не чужынцаў, не рабаўнікоў, а тых, хто нарадзіліся і жылі на гэтай зямлі ад самага яе пачатку, а таксама тых, хто, прыйшоўшы сюды зь мірам, зрабіў яе сваім домам, каго яна прыняла і далучыла да сваіх уласных дзяцей, народжаных яе целам, яе водамі і лясамі ад магутнага подыху неабсяжнага айца-неба і яго палымянага каханьня.

І з такім жа палымяным сэрцам і магутным целам паўставалі зь яе яе сыны - як муры, як неадольныя замкі. Гэтую сьцяну было не зламіць, не разбурыць, не пасунуць, хоць яна і была жывой, ды мела моц каменю і яго трываласьць, упартасьць.

Ні моц чалавечая, ні вада, ні вагонь, ніякія сілы зямныя ня здольныя пасунуць тое, што падмуроўваецца моцай духа.

Калі дух непахісны, то не пахісьнецца і цела. І зямля гэтая будзе стаяць, трымаючыся на іх надзейных плячах.

Глава 1: Цяжар

Багдан сышоў, і ён застаўся адзін у пакоі.

Скамячанае футра шапкі валялася ў яго пад нагамі. Не заўважаючы, ён пераступіў цераз яе. Падыйшоў да вялікага сталу, на якім мапы ляжалі, прыціснутыя кнігамі. Яго рука некалькі імгненьняў вадзіла па паверхні дасканала прамаляванае краіны вастрыём тонкага, нагадваючага джала стылета. А потым ён размахнуўся, і нечакана для самога сябе ўсадзіў лязо ў драўляную паверню. Яно быццам бы падзеляліла краіну папалам. Русь і Літва. Палымяная лінія загарэлася, набрыняла крывёю.

- Гэта будзе, - падумалася яму. - Гэта ўсё яшчэ нас чакае. Бо, каб па-сапраўднаму зьяднацца, спачатку мы павінны разьяднацца. Аддзяліць ад сябе чужынцаў. І чужынец гэты - ня ён. Не яму сыходзіць з роднай зямлі, бегчы як параненаму зьвяру праз лясы і багну каб захаваць рэшткі годнасьці, забіўшыся ў кут далёка ў чужой краіне. Не для таго ён тут усё будаваў, наладжваў пад сябе, улажыў душу, каб бегчы. Хай другія бягуць. Тыя, хто здрадзілі, ласыя на чужыя грошы. Гэта яны - чужынцы, а ня ён. Ён застанецца. І будзе змагацца за свой дом і за сваё жыцьцё, за тых, хто яму дарагі, і чыё жыцьцё зараз было ў яго руках.

Раптам быццам увесь цяжар апошніх год лёг на яго плечы. Сколькі ўсяго адбылося! Ня доўгімі былі мір і цішыня, якія нарэшце запанавалі пры Вітаўце. Князь-волат здолеў з’яднаць краіну, сьцягнуць яе ў адзінае цэлае нібыта жалезнымі абручамі сваёй волі. Аднак абручы спарахнелі, бо нішто не бывае адвечным. Памёр князь, і трэснуў, пайшоў па швах крохкі мір, ізноў старыя раны адкрыліся, і ліванулі крывёю. Чырвоная, яркая, хутка затопіць яна сабой не чакаючы бяды край.

Першая рана адкрылася на Падольлі, адкуль цяпер прыскакаў Багдан. Усё Падольле гуло, гула і Валынь. Сьвідрыгайла, намагаючыся здабыць як мага больш хаўрусьнікаў, узьняў

князёў-русінаў, каб трымаліся яго, каб паўсталі супраціў Кароны, нагадваў аб былым ўціску, няспраўядлівасьцях, крыўдах, якія таіліся здаўна. Асабліва адчувальнымі ж былі пытаньні веры, якія адлюстраваліся ў Гарадзельскай уніі, пазбаўляўшай праваслаўных права займаць вышэйшыя пасады. Каталіцкая, рымская вера была абраная і Ягайлам і Вітаўтам як адзіная дзяржаўная для ўсяго літоўскага, русінскага і жамойцкага краю. І калі новаахрышчаныя паганцы ня мелі нічога супраціў касьцёлу, то рускія князі, якія з даўніх год трымаліся старога грэцкага абраду, не хавалі абурэньня. Вера праваслаўная і сапраўды пусьціла тут доўгія карані, мела багатую абраднасьць і традыцыі, мова руская здаўна была мовай дзяржаўнай, распаўсюджанай у краіне шырэй за лацінскую, польскую і іньшыя. Так павялося са старых часоў, што і першыя літоўскія князі, як і сам Вітаўт, хрысьціліся па праваслаўнаму чыну. Праваслаўнымі былі і Альгерд, і сам Ягайла, які ў дзяцінстве быў хрышчоным пад імём Якаў. Рускія князі не далі Гедыміну абраць каталіцтва, ды той ня дужа і намагаўся, як і Кейстут, і абодзьва памёрлі паганцамі. Альгерд жа вока сваё паклаў на Ўсход, паставіўшы мэтай вызваліць гэтыя землі ад тыраніі Арды, і дасягнуў посьпехаў, падпарадкаваўшы сваёй уладзе Смаленск, адкуль хадзіў і на Маскву, таму праваслаўе было для яго натуральным і жыццёва важным выбарам. Але ж цяпер час зьмяніўся.

Вітаўт здолеў пашырыць краіну па-за межы, куды працягнулася Альгердава рука, падпарадкаваўшы Вязьму, Каложу, Бранск, Мценск, Казельск, замацаваўшыся ў землях чарнігаўскіх і кіеўскіх, падольскіх, і валынскіх, зьяднаўшыся ў хаўрус з тверычамі, пашырыўшыся далёка па-за межы смаленскае зямлі, і на ўсход, і на поўдзень, на поўначы ж праз Жэмайцію дасягнуўшы берагоў Варажскага мору. Але ж у моцы краіны, створанай Вітаўтам, хавалася і яе слабасьць. Яе вялізныя памеры рабілі край надта ўразьлівым для суседзяў, якія намагаліся вярнуць тое, што страцілі, а яшчэ ня горш было б і разжыцца новым. Усе памежныя землі наогул былі спрэчнымі, не набыўшы трываласьць той, старой Літвы, якой былі Гародня, Ліда, Наваградак, Трокі і Вільня, Крэва ды іньшыя гарады на паўночным ды паўднёвым захадзе. Сэрцам краіны была Літва,

якая, аднак, апіралася на моцныя ногі ды трывалыя рукі русінскіх княстваў. Так, смаляне значна дапамаглі ў ходзе Грунвальдскай бойкі, не аднойчы меч рускіх князёў падаў на пухнатыя шапкі ды вострыя шэломы арды, разам зь літоўцамі біліся русіны і зь лівонцамі, і з тэўтонамі. Гэтую моц нельга было недаацэньваць, сяброўствам такім ня трэба было бракаваць. Ды вось, адбылося, што адбылося. Вера з'ядноўвае, ды яна ж і раз'ядноўвае, і робіць як братамі, так і ворагамі, і чужынцамі. Шмат год Карона намагалася дабіцца хаўрусу зь Літвой – суседам моцным і небясьпечным. І вырашыўшы, што бойкі ды свары будуць на руку толькі што агульным ворагам, паны-браты здолелі падпарадкаваць Літву па-добраму, дакладней – падарыўшы ёй ня многа ня мала, а самое Польскую карону. Аддаўшы сваю адзіную зорачку, дзяўчынку-караля Ядзьвігу літоўскаму дзікуну, як называлі Ягайлу, абраўшы яго перад герцагам аўстрыйскім, яны зрабілі прапанову, адмовіцца ад якой было нельга. Ягайла пасеў на трон. Гісторыя пачалася – агульная гісторыя дзьвух краінаў, поўная перамог і паразаў, гора і радасьці, спрэчак і братаньняў, і так на доўгія гады, за якія было ўсё. Не было толькі аднаго – роўнасьці. Бо ж Карона мела моцны ўплыў, тым больш небясьпечны, што ён ня быў прымусам. Літву праглыналі паступова, і гэта ёй падабалася. Баляваць у польскіх палацах было значна весялей, чым у суворых літоўскіх замках. Праз Польшчу ляжаў шлях далей – да краінаў багатых, дзе была і асьвета, і навука. Рым вабіў і веліччу абрадаў, і магутнасьцю сваёй улады, якой падпарадкоўваліся найбуйнейшыя каралі, і мовай, блізкай да старой літоўскай, і радством кроўным, якое мясцовая знаць адчувала з даўніх часоў. Рым быў маці, касьцёл быў бацькай, і таму былыя “літоўскія дзікуны” радасна прымалі яго абдымкі. Праваслаўе ж стала слабым. Падточанае ардой, яно ня мела і малой часткі той моцы, якой мог пахваліцца Рым. Візантыя хісталася пад націскам сарацынаў, і было відавочна, што яна вось-вось падзе. Канстантынопаль быў ледзь жывы. Масква ж ляжала пад Ардой. Трымацца за праваслаўную веру было вар'яцтвам. Ён разумеў гэта. Усе разумелі гэта. Павярнуць у той бок Ліцьве было немагчыма. Разам з Масквой атрымоўваць ярлыкі на княства ад ханаў? Ад гэтай думкі яго кінула ў жар. Што тады застаецца? Хістаючыйся калос Візантыі? І атрымаць наймагутнейшага ворага ў твары папежу? Як яны

сабе гэта ўяўляюць? Колькі разоў ён размаўляў зь імі, гэтымі ўпартымі, апантанымі русінамі. І толькі чуў ад іх – нашая вера, нашыя звычаі, старыя, ад дзядоў, мы павінны трымацца… .

Ён запытваў: “Трымацца чаго?” І чуў адзіны адказ – ізноў: ад дзядоў, павінны, вера. Патлумачыць лагічна яны яму не маглі. У чым – вера? Бог, ён жа адзіны Бог. Якая розьніца, як вы будзеце яму маліцца? На лацінскай, ці рускай мове? Але ж апошняе было для іх надта важным. І гэта яшчэ можна было зразумець. Бо – страціць мову, гэта як страціць душу. Страціць свае кнігі, свае накопленыя за стагоддзі веды. Але ж Вітаўт прапаноўваў унію, і нічога ня трэба было б мяняць. Ды і тут нічога не атрымалася. Заўпарціліся, паўсталі сьцяной. Усе рускія папы ўзьняліся. Як гэта – унія? Трымацца веры! Не скарацца сьхізматыкам. Канстантынопаль, спарахнелы, ледзь дышачы на ладан, падліваў масла ў вагонь. Канешне ж, гублялі апошнюю ўладу. Хутка ён канчаткова ляжа пад асманскую пяту, і з чым яны застануцца? Усё роўна прыйдзецца абіраць. Ён як у ваду глядзеў. (Меньш праз дзесяць год Фларэнтыйская унія ўсё ж прывядзе праваслаўных гэтага краю пад уладу Рыму). Ведаў ён гэта розумам, адчуваньнем, нейкім зьвярыным чуцьцём. Яму хацелася крычэць, трэсьці іх за каўнеры раскошных, аточаных футрам сукняў. Прачніцеся! Апамятайцеся! Не трымайцеся за тое, што болей нельга ўтрымаць, што сыпецца праз пальцы, як пясок, за мінулае, за сыходзячае. Адкройцеся новаму, паглядзіце, як жывуць вакол! Адкройце вочы асьвеце, дабрабыту, законам, парадку, вучыціся ў лепшых, каб самім стаць лепшымі зь лепшых. Не, толькі качалі галовамі ў багатых футравых шапках, пасядалі ў сваіх палацах, як цеста ў залатых квашнях. Думалі, што так яно будзе заўсёды – пакой, цішыня, старажытнасьць, узьведзеная ў культ. Ня Богу маліліся, а старым яго косткам у кайданах залатых акладаў.

- Раскрыйце вочы, - казаў ён ім. – Дзе тут Бог? Бог – на нябёсах. Кесару – кесарава, Богу – Богава. Вы руйнуеце краіну, ірвеце яе, як ваўкі. Яму казалі – краіну ірвуць палякі.

Ён запытваў:

- Вы жадаеце вайны? Ізноў? Колькі іх ужо было, гэтых войнаў паміж палавінамі аднаго цела, калі левая рука біла правую? Ці

ня лепш паставіць шчаку? Не, ня лепш. Не жадаем. Вітаўт сьсівеў ад іх, сьціскваў зубы. Кідаўся паўсюль, як шалёны, ня спаў начамі. Усё думаў, як з'яднаць гэтых не жадаючых братэрства братоў. Унія не адбылася. Зямлю ён мог трымаць, розум жа – не. Асабліва калі трымаць было ня шмат. Упартасьць русінаў, якія учапіліся за свае старыя звычаі – вось у чым бяда краіны. Ён пакачаў галавой. Галава была ўжо сівая. Вітаўт пасівеў раней – годы цяжара ляглі сьнегам. Карона так і не ўпрыгожыла яго галаву, браты-палякі не далі. З усіх бакоў браты – як ваўкі. Бедная Літва. Ён сьціснуў кулакі. Трываў, сьціснуўшы зубы, колькі год. Трымаў і трываў, разам з князям і некалькімі вернымі, разумнымі паплечнікамі, жыў у сядле і вазку, колькі вандровак, калі і быў, то наездамі, дзеці расьлі безь яго, толькі зьдзіўляўся, як хутка яны растуць, як сталеюць. Яна разрывалася паміж мужам і домам, суправаджаючы яго ў вандроўках, зьзяла на балях, прыёмах, дзе ўсех ураждвала сваёй прыгажосьцю, зносіла цяжары вандроўчага жыцьця, мяняла дамы, як сукенкі, ня маючы і хвіліны спакою. Яна казала, што ёй падабалася. Але ж каму можа падабацца такое бадзяжнае жыцьцё! То ў самоце, то трэсьціся па размоклых дарогах, начаваць у корчмах, жыць пры чужых дварах. Інакш – сядзі адна, як прынцэса ў зачараваным замку. Але ж пасьля таго нападу на іх маёнтак пакінуць яе ён ня мог. Таму заўсёды браў з сабой. Дзеці расьлі пры Вітаўтавым двары. Трокі сталі ім другім домам.

Калі ж ён вяртаўся дамоў, як цудоўна гэта было! Як ён любіў свой ціхі, глухі, лясны край. Пры думках аб родных мясьцінах, аб сям'і замілаваньне напаўняла яго душу. Вось дзеля каго ён змагаецца, і будзе змагацца – дзеля іх. Каб жылі на радзіме, якая б была ня горш за чужбіну, каб квітнеў, і рос гэты край, набіраўся моцы, каб прыцягваў усё лепшае адусюль. Але ж толькі трэба патрываць. Яшчэ апошняе намаганьне, яшчэ невялікі штуршок. Каб ён ведаў, што яго чакае. Каб ён толькі ведаў… Але ж сумныя думкі паступова адпусьцілі яго.

Зь ім быў, і ёсьць Бог, які вядзе яго. Падтрымае яго руку, пакуль яна можа трымаць меч. Колькі б яму не засталося, і можа так, што і ня шмат, але ж ён ня зваліцца, будзе стаяць – як той дуб, які разваліла маланка. Апалены, але ж не пахіснуўшыйся. Яго

зямля падтрымае яго, яго Бог дасі яму моцы. Яго сэрца пачынала біцца раўней, болей не балела, ня ціснула. Хай будзе, што будзе, а ён будзе рабіць усё, што зможа. І што ня зможа, будзе рабіць так сама.

Глава 2: Жонка

- Нячыстая... - пачула яна шэпт за сьпіною.

- Ён ачысьціў мяне, - ціха, нячутна вымавіла яна.

Жанчына адвяла вочы. Яна горда ўськінула галаву. Яна павінна трымацца, несьці сябе, як сапраўдная гордая паненка, бо ж яна цяпер ня проста дзіця, дзяўчынка ў заточаньні высокіх, шэрых манастырскіх муроў, сьціплая, ціхмяная, жадаючая гаварыць толькі з Богам.

Яна - яго жонка, і яе чэсьць - яго чэсьць, а яе годнасьць - яго годнасьць.

Але ўсё ж, у душы яна заставалася такой, як і была - пяшчотнай, сьціплай, безабароннай, жадаючай цішыні ўнутры і звонку, дзе яна магла б быць толькі разам зь ім.

Усе гэтыя раскошныя адзеньні, аксаміты і шоўк, каштоўныя камяні, ланцугі і каралі, пацеркі, дыядэмы, дарагія вазкі, шыкоўныя мэбля і посуд, і бясконцыя лябірынты палацаў з такімі ж бясконцымі лябірынтамі адносінаў у іх - усё гэта мала радавала яе, больш абцяжарвала. Яна разумела, што была б шчасьлівейшая зь ім і ў хаціне, недзе на ўскрайку мора ці вялікага возера, жывучы жыцьцём простым і шчырым, прачынаючыся і засыная на яго грудзях, гатуючы ежу, робячы звычайныя справы. Аднак яму яна не жадала такога жыцьця. Ведаючы яго вялікую душу, яго востры розум і вока, тое, на што ён быў здольны, яна ня бачыла яго меньш чым правай рукой Вялікага Князя. Яна разумела, што пасаду гэтую ён займае па праву, што месца яго тут, з гэтымі людзьмі, наперадзе і ў гушчары падзеяў, быццам бы на вастрые дзіды, якую скіраваў за яго лёс. Ёсьць шляхі, якія мы ня ведаем, і якіх не чакаем, але нам трэба іх прайсьці, бо мы для іх нарадзіліся на сьвет.

Ён нарадзіўся для вайны і славы. А яна нарадзілася, каб кахаць яго. Быць яго душою, ляжаць скарбам на яго грудзях, асьвятляць яго сэрца ў цемры, калі згасьне ўсё сьвятло вакол. І

калі патрэбна, то і аддаць за яго ўсё, што ў яе было, згубіць мір і спакой, і атрымаць бяссонныя ночы і боль, калі яна чакала яго, малілася за яго, думала аб ім, пакуль ён вандраваў па бясконцых цёмных дарогах, кіраваў баявымі атрадамі, удзельнічаў у перамовах, прыязжаў стомлены, і рэдка калі шчасьлівы, абдымаў яе, адпачываў, і з'язжаў зноў. З самага пачатку ён як мага часьцей намагаўся браць яе з сабой. Гэта быў нейкі яго жывотны страх, жах яе пакінуць. Пасьля таго вяртаньня на пагарэлыя руіны кляштару ён болей не жадаў рызыкаваць, пакідаючы яе адну. Разам яны пабывалі ў такім мностве месцаў, што ўсе яны зьмяшаліся ў яе памяці ў вялікі стракаты вір.

Яна прытулілася ілбом да халоднага ваконнага шклу – мутнаватай каляровай шыбы, складзенай з круглых кавалачкаў у хітры арнамент.

За яе сьпіной на стале патрэсквалі сьвечы – мноства таўстых васкавых сьвячэй кідала змрочныя блікі на сьцены, заганяла цемру высока пад столь. Сцены, зацягнутыя габеленамі, выглядалі таямнічымі праваламі ў дзівосны, казачны сьвет, зь якога, зь ляснога гушчару, выходзілі магутныя жывёлы – рагатыя алені, дзікі, мядзьведзі, скочылі ўзброеныя вершнікі, а прыгожыя дзевы гралі на лютнях перад застыўшымі ў захапленьні рыцарамі. Ідылічныя карціны, так далёкія ад жыцьця. Недзе за сьцяной чуўся рогат і крыкі. Кампанія гасьцей бавіла час, забаўляючыся штукамі шутоў, непрыстойнымі, яна была ў гэтым упэўнена. Яна схавалася тут, у цішыні прыватнага пакою, стомленая натоўпам, размовамі, гулам і мітусьнёй. Замак у Кракаве ўражваў сваімі памерамі, уяўляючы сабой цэлы горад з чырвонай цэглы, з прыгожымі гатычнымі вежамі, саборам, ратондай і некалькімі царквамі. Пабудаваны амаль стагоддзе таму ў лепшых традыцыях еўрапейскага абарончага стылю, ён спалучаў магутнасьць і трываласьць чырвоных грамадаў кастэляў старой Літвы з пышнасьцю і веліччу гішпанскіх і французкіх будоваў. Яшчэ калі Вітаўт быў жывы, ім выдзелілі асобныя пакоі – некалькі памяшканьняў, спалучанных хадамі, частка зь якіх – таемныя. Зь яе пакою ў наступны вялі шырока адчыненыя дзьверы, за якімі адкрываўся пусты вялікі пакой, застаўлены раскошнай мэбляй, зацягнуты парчовымі

парцьерамі. Пакой выглядаў пустым, але ж гэта было толькі ўражаньне. За адной са шпалераў сакрэтныя нізкія разныя дзьверы вялі ў другі, крыху меньшы, але ж ня меньш раскошны пакой, які асьвятляўся вузкімі вокнамі пад паталком і сьветам масьляных лямпаў. І ў тым пакоі, яна ведала, зараз ішла размова. Рада на чале зь Ягайлам абмяркоўвала тое, што адбывалася. Некалькі чалавек – толькі самыя набліжаныя: Вітаўтавы брат Жыгімонт, пан Зарэмба, маршалак Ланцкаронскі, колькісь прадстаўнікоў літоўскіх радоў, і яшчэ колькісь рыцараў, якіх яна ня ведала. І яшчэ там быў ён.

- Як гуляе лёс! Быў правай рукой Вітаўта, стаў – левай рукой Ягайлы. Ён усьміхнуўся сам сабе. Бо правых рук у Ягайлы хапае. Так адбылося, што справы дзяржаўныя вымусілі іх сыйсьціся. Ягайла, хітры стары, таксама жанаты на адной з Гальшанскіх дзяўчын, якая, на шчасьце, не цікавілася ім так, як Юльяна, бо ж была зусім маладая і паглядала на зграбных хлапцоў, якіх хапала пры двары, наблізіў яго адразу пасьля таго, як адгучэлі апошнія жалобныя набажэнствы. Проста падыйшоў да яго, калі ён стаяў ля надмагільля, апусьціўшы галаву, задумаўшыся, ды ўжо не аб мінулым – аб будучым, паклаў руку на плячо, і прапанаваў службу. Ён пагадзіўся, бо хацеў служыць радзіме. І радзімы цяпер, ён разумеў, у яго было дзьве. Як Карона не абыдзецца бяз Княства, так і Княства не абыдзецца без кароны. Пабраўшыся шлюбам з Польшчай, Ягайла ня думаў, што шлюб гэты стане сапраўдны трывалым – здаецца, на вякі. І Сьвідрыгайлавы намаганьні адарвацца, вырвацца з гарачых польскіх абдымкаў, здаецца, яшчэ больш умацоўвалі гэтую іх сувязь, зьліваючы іх у адзінае, непадзельнае цела, цесна пераблытанае, пераплеценае зброяй, гербамі, шлюбамі і стасункамі. Але ж ня меньш трывалыя сувязі былі і з таго, рускага боку, і адтуль іх таксама цягнулі, падштурхвалі.

- Падольле тлее, і хутка запалае. Ягайла адкінуўся на лаве. Водбліскі вагню гулялі па яго худым твары, нагадваючым профіль драпежнае птушкі. Вумныя, вострыя вочы вывучалі твары прысутных. Рыцары згодна ківалі галовамі, краналі рукой вусы, гладзілі доўгія бароды. Іх твары былі змрочныя. Не да жартаў, не да кпінаў.

- Маліцца ў пару, - падумалася яму. Жарты сканьчыліся, як толькі за імі зачыніліся гэтыя патаемныя дзьверы. Смех і рогат, скокі прыдворных шутоў, баляваньні і галантныя размовы – усё засталося там, звонку. Тыя, хто сядзелі тут, мелі выраз сухі, суворы. Не прыдворныя блазаны – ваяры-рыцары сабраліся на ваенны савет. Як бараніць краіну? Дакладней, абодзьве краіны? Трэба ўтрымаць Падольле – важны стратэгічны край.

- Мы войдзем туды першымі. Зарэмба ўзьняў галаву. - Трэба апярэдзіць княскія войскі.

- Гэта будзе захоп. Жыгімонт з сумненьнем пакачаў галавой.

- Гэта будзе правільна, - раптам вымавіў ён. Усе твары павярнуліся да яго.

- Ці ты не ліцьвін? – Зарэмба ўсьміхнуўся.

- Ліцьвін. Ён памарудзіў. - Аднак я служу каралю. І мая справа – раіць, і раіць добра. Бо які б тады я быў слуга, які, трымаючыся свайго спадара, насамрэч служыць яго ворагу? Але ж Сьвідрыгайла – ня толькі вораг Кароны. Насмрэч ён – і вораг Літвы. Проста гэта яшчэ ня ўсе разумеюць. Ды зразумеюць хутка. Жыгімонт кіўнуў галавой. Міхась паймаў яго позірк – пранізьлівы, ледзь заўважны. Яму здалося, што Жыгімонт нябачна падбадзёрвае яго.

- Войскі Кароны ўвойдуць на Падольле, і замацуюцца як мага трывала. Ягайла замаўчаў – думаў.

- Але ж гэта будзе вайна, - раптам дадаў ён. – Вы гатовыя да вайны, панства? Панства кароннае, і панства літоўскае? Ён кіўнуў у бок Жыгімонта.

- Гатовыя. Жыгімонт спакойна глянуў на яго. – Мы гатовыя да гэтай вайны даўно. – Так, Міхал? Ён павярнуўся да яго.

- Гатовы, мой князь. Ён нахіліў галаву. – Як служыў я вашаму брату, так буду служыць і тым, хто па крыві мае права на яго прастол. Прабачце, за выключэньнем аднаго. Я б хацеў служыць яму, ды гэта не магчыма. Да таго ж, тут я маю мае

персанальныя рахункі, якія б ня значылі нічога, калі б радзіме служыў і ён.

- Такім чынам, я перадаю цябе Жыгімонту. Ягайла ўзьняўся. - Мы працягнем потым. Я стаміўся, бо, прабачце, я ўжо стары. А вы, маладыя, абмяркуйце дэталі паходу. Заўтра дакладзеце мне. Ён кіўнуў Зарэмбе. Міхась устаў, і адчыніў дзьверы.

Ягайла выйшаў з пакою, прайшоў праз вялікую пустую залу міма яе, быццам бы стары, сівы цень. Здавалася, ён не глядзеў нікуды, акрамя таўстога дывана пад нагамі, але ж яго вострыя чорныя вочы заўважалі ўсё. Заўважылі яны і яе. Высокая чорнавалосая жанчына ціха, як цень, стаяла ля вакна, таямніча зьзяў золатам цёмна-сіні аксаміт, дарагія ўпрыгожваньні на яе белай скуры.

- Цікавая ў Міхала жонка, - падумалася яму. – І дзе ён яе знайшоў? Не палячка і не літоўка. Валашка? Але ж хутка думкі яго зьмянілі накірунак. І цяпер ён ізноў думаў аб дзяржаве – аб ёй, і толькі ёй, ужо многа год – сваёй адзінай каханай, ненавіснай і жаданай, якая зьвяла на нішто ўсё яго жыцьцё, дала яму ўсё, і ўсё у яго адабрала. Ня меў ён жыцьця – меў Карону. Польшчы служыў, як верны стары пёс, і яна ўчапілася ў яго – не адарвеш. Брат таксама служыў Ліцьве, ды вось, вызваліўся. Сьпіць зараз брат, і ў вус ня дуе. Хоць і вусоў у яго не было – дзіва. Ня вырасьлі. Ён яшчэ і жартваў зь яго, казаў, мо, ты – баба? Той злаваўся. Ён заўсёды злаваўся. Малады, гарачы. Многага жадаў, ды атрымаў вось – каменны палац шырынёю ў плечы. Ён жа так шмат ня прагнуў, ды вось – Бог даў яму ўсё. І карону даў. Ён колькі разоў выракаўся, казаў – ня трэба. Усё роўна яна да яго як прыклеілася. Так і памрэ ён з каронай на галаве. Хутчэй бы, - раптам падумалася яму. – Сустрэцца бы зь Ядвісяй. Там, па-за сьветам, дзе няма ні каралёў, ні круляў, ні багатага, ні гаротнага. Абняць яе, павініцца. Пажаліцца, як ён стаміўся. Яна яго пашкадуе. Яна там зараз з дачкой – шчасьлівая. А гэтыя маладыя – яны ня грэюць, здаецца, усё больш ледзяняць яго кроў. Раптам перад яго вачыма паўстала тонкая, маленькая жаночая постаць з доўгімі хвалямі залатых валасоў, сур'ёзным позіркам, строгім. Глядзела на яго, як сьвятая на чорта. А потым бязгучна

заплакала. Сьлёзы каціліся па яе бледнаму, ня маючаму фарбы твару. Ніякіх упрыгожваньняў, і жалобны чорны нарад. Выхадзіла за яго, як на той сьвет. Ён жа – чорт. Ён усьміхнуўся. Ці ёсьць у Ягайлы хвост? Добра, што на праверку накіраваўся стары сябар – Завіша. Той упэўніў красуню, што ня толькі хвасту няма, але ж і ўсё астатняе дужа спраўнае. Яна пагадзілася – а куды дзявацца. Але вось, убралася ў чорнае. Стаіць, глядзіць на яго. Выйшаўшы з пакою, ён раптам пахіснуўся. Апёрся рукой аб сьцяну. Махнуў рукой кінуўшамуся да яго ваяру. Яшчэ ня мой час, адыдзі. Сам дайду. Марудна, цяжка, пакрочыў у свае пакоі. Там чакае прыгажуня-Соф'я, і, можа, на пэўны час ён здолее забыць жалобны прывід, які так ірве яму сэрца.

- Прапаную абмеркаваць заўтра, з раніцы. Жыгімонт узьняўся. – Бо мяркую, трэба пераспаць з думкамі. Усе пагадліва замахалі галовамі, шумна паўсталі – стаміліся. Дзень быў доўгі, спачатку – прыём у караля, потым пасьля абеду адразу паселі тут, і вось, не разыходзіліся да позьняй ночы. Па аднаму яны прайшлі праз пакой – высокія, апранутыя ў раскошныя адзеньні постаці, міма яе, хто так, задуменны, а хто і слізгаючы па ёй позіркам. Яна ўжо звыклася з гэтымі іх поглядамі, хцівымі, пажаднымі, ці проста цікаўнымі, як на заморскае дзіва.

- Ну што ў ёй такога? – падумала яна ў каторы раз. – Ды, напэўна, нешта ж для іх ёсьць. Ніколі яна не жадала гэтае ўвагі, не намагалася прыцягваць да сябе вочы. Яны самі прыцягваліся. Ліплі да яе, як мёд, якога хутка станавілася занадта. Яна ж іх быццам бы ня заўважала, як і ён, хоць бровы яго калі-некалі хмурыліся, а вочы набрынялі крывёю. Але ж ён давяраў ёй больш, чым самому сабе. Сумнявацца ў яе вернасьці і каханьні да яго ён лічыў ганебным. А што глядзяць – хай глядзяць. Прыгажосьць для таго і створана Богам, каб на яе дзівіцца.

Ён выйшаў зь дзьвярэй апошнім, шчыльна прыкрыў іх, чорнае дрэва закрыла парцьера, і ўсё стала, як было. Правадзіў астатніх, вярнуўся, і падыйшоў да яе. Яна адчула пах яго адзеньня – тонкі, крыху дымны водар. Павярнулася ад вакна. Ён ахапіў яе за плечы, глядзеў прама ў вочы.

- Стамілася чакаць, любая? – вымавіў нягромка.

- Стамілася, любы. Яго твар насупраць яе быў асьветлены бледным вулічным сьвятлом – ноч была месяцовай. Сьвечы за яго сьпіной адбівался вакол яго галавы чырванаватым арэолам. І ізноў яна зьдзівілася, які ён прыгожы, хоць мінула ужо больш за пятнаццаць год, як яна ўпершыню ўбачыла яго. Цяпер яго валасы сталі амаль сівымі, але ж вусы і барада засталіся чорнымі, як і яго бровы, і позірк быў малады, хітры, усьмешлівы, гарачы. Толькі мяккасьці дабавілася ў яго твары, нейкага асаблівага сьвятла. Ён стаў яшчэ прыгажэйшым, раптам падумалася ёй. Яна глядзела на яго, узьняўшы твар, з замілаваньнем вывучала яго рысы.

- Ты – сонца маё. Сэрца маё, - ціха вымавіў ён, і прыцягнуў яе да сябе. Яна схавала твар у яго на грудзях.

- Цяжка было? – запытала яна яго.

- Цяжка, каханая. Цяжкаісьці вайной на сваю зямлю, якая становіцца для цябе чужой. Будзь ён пракляты, гэты дзень, калі нага ўласнага войска ступіць на родную зямлю, як на чужынскую. Будзь ён пракляты, і каб ён ніколі не надыйшоў. Але ж мяркую, так і будзе. Ты застанешся тут, у Кракаве. У Літву табе ехаць нельга. Дзеці будуць у кляштары. Іван жа ўжо вялікі … раптам ён задумаўся, заціх. Яна з жахам глядзела на яго.

- Ня думай! – казалі яе вочы, крычэлі нема.

Ён качнуў галавой. – Рана. Ня тая гэта вайна. Не хачу я яму ганебнае славы. Пачакаймо. Можа, і праміне. Наўрад ці Сьвідрыгайла гатовы ўсур’ёз змагацца за Падольле. Але ж бяз бою не абыдзецца, і крыві яшчэ праліецца.

- Пайшлі адпачываць, каханая.

Ён ляжаў у ложку, і глядзеў на яе – як яна распранаецца, зьнімае сукню, пышныя, цяжкія спадніцы, застаючыся ў адной празрыстай шаўковай сарочцы. Яе доўгія косы грывай ліліся амаль да падкаленак. Яна распляла іх, і цяпер нагадвала

русалку – чараўнічую, недасяжную прыгажуню, жыхарку вазёр, рэк і патаемных багністых мясьцінаў. Асьцярожна ступая басымі нагамі па пухнатаму дывану, прама як русалка па мокрай траве, яна падыйшла да ложку. Нахінулася над ім. Яе грудзі ў вырaзе кашулі апынуліся нізка ля яго твару. Ён прыцягнуў яе да сябе, пасунуў тонкую тканіну, і злавіў вуснамі набухлы сасок. Яе пах ахутаў яго – цёплы, духмяны, знаёмы. Так пахне маладая лань, падумалася яму - тонкім мускусным пахам, лесам і лугавымі травамі, малаком і вастрынёй, так, што ўздрыгвае сэрца. Яе рукі ахутвалі яго, агортвалі, гладзілі яго галаву, прытулялі да малочна-белага, духмянага цела. Адчуваючы, як яго напаўняе жаданьне, ён нахінуўся над ёй. Яна зусім не зьмянілася, такая ж танюткая, тонкая талія, празрыстая скура. Толькі грудзі зь дзявочых пераўтварыліся ў прыгожыя жаночыя. Белае, мяккае, пяшчотнае цела, якое ён так добра ведаў, і якое ўсё роўна было для яго таямнічым, загадкавым.

Як дзіўна яно абуджае ў ім жаданьне! Якая неверагодная сіла схаваная ў гэтым слабым целе. За яго могуць весьціся бойкі, заваёўвацца гарады. Валодаць такой жанчынай – як валодаць крэпасьцю, поўнай скарбаў. Яна ляжала пад ім, як скарыўшаяся яму зямля, якая прыняла яго ўладу, на якой ён адчуваў сябе гаспадаром – самаўластным, зь якой чэрпаў незьлічоную моцу, якой прагнуў, і якая стала яго жыцьцем. Калісьці гэта была тонкая, пяшчотная дзяўчынка, амаль дзіця, падлетак. Цяпер жа гэта стала прыгажуня, якіх мала можна знайсьці ў сьвеце. Але ж для яго яна засталася такой жа трапяткой, ціхай, задуменнай, уразьлівай, дрыжачай ад дакрананьня яго вялікай рукі, аддаючайся яму, закрыўшы вочы з доўгімі павейкамі. Яе рука мякка дакранулася да яго, пагладзіла яго плоць, якая адгукнулася на дакрананьне яе тонкіх пальцаў, налілася крывёю. Увайсьці ў яе - якая гэта была асалода. Яна выгнулася пад ім, прыціскаючыся мяккім улоньнем да яго сьцёгнаў. Быццам бы палац вакол іх зьнік, і яны апынуліся на Пяруновым полі, пад дубам, у травах. Яе сьцёгны падкідваліся ў такт зь яго рухамі, і ён адчуваў, як наліваецца моцай, як неба – чорнымі навальнічнымі хмарамі. Яго сэрца хадзіла ўсё хутчэй, цяглы напружыліся, рухі з асьцярожных зрабіліся жорсткімі. Яна ўскрыквала пад ім – ад асалоды, і болю. Чорнае неба кружылася

вакол, дуб шумеў, цела русалкі пад ім выкручвалася і прыціскалася да яго, адсоўваючыся і ізноў набліжаючыся. Гэтае зьліцьцё было для яго бойкай, дзе ён кахаў, і адначасова катаваў гэтае прыгожае цела, разьдзіраючы яго сваімі рухамі, ня маючы магчымасьці стрымацца, усё хутчэй і мацней, пакуль на іх не паліўся дождж. Яе бліскучы твар заблытаўся ў валасах-травах, экстатычны, вусны прыадчыненыя, вільготныя вейкі нагадвалі чорныя стрэлы. Ён апусьціўся на яе, і накрыў сабою. І адчуў, як іх ахутвае ціхая, мяккая, гаючая цемра.

Глава 3: Разьвітаньне

Імчаць хутканогія коні, імчаць няспынна. Вось ужо горы мінулі, і Карона засталася далёка за сьпіною. Біюць капытамі дрыгканты, ляцяць камякі глебы, плывуць за плячамі леапардавыя скуры, ціха зьвіняць дасьпехі. Шырокая, роўная зямля раськінулася перад войскам. Ляжыць яна, быццам абрус накрыты, быццам бы жанчына, што чакае свайго каханка. Бьюць капыты, шумяць сьцягі, прыгнулі вершнікі галовы – сьпяшаюцца: хутчэй, пакуль ніхто не апярэдзіў, пакуль сьпяць гарады, ціхія, мірныя, пакойна ляжаць у далінах і на пагорках. Вось ужо і першы зь іх паказаўся: Камянец на Падольлі. Магутны замак паўставаў у ранку з туману, хаваўся ў хмарах. Прахалода песьціла яго, золата кранула галовы дрэваў, асыпалася на траву.

Замак а шасьці вежах нагадваў карабель – шырокі, магутны, узвышаючыйся на скале, як на хвалі, застыўшай каменнай пенай, азіраў краявіды. Шырокая дарога спала, калі войска рушыла па ёй, узьбіваючы тонкі пыл. Перад імі закрытая брама цямнела ў шэрых, адмытых да белага дажджамі, высушаных вятрамі сьцянах. Яны спыніліся перад ёй на масту, праложанаму па скале.

- Хто там? – запыталі іх зь вежы.

- Свае. Войска Кароннае. Весткі вязем сьпешныя. Старасту паклікай!

Голас Грыцько, ясны, звонкі, адбіўся рэхам ад каменных сьценаў. Ён пасунуў шапку далей, на вуха, падкруціў зухавата чорны вус.

- Не вайна, а сьвята. Быццам бы на вясельле прыскакалі.

Брат Тэадора Бучацкага Міхал крутнуў каня, затаньчыў на месцы – самы малады з усіх, стройны, прыгожы, зь мяккімі каштанавымі кудзерамі, задуменнымі зялёнымі вачыма. Граза ўсіх паненак ад Вялікай Польшчы і да Малой, ад Сілезіі і да

Мазовіі з Падляшшам, ён і на вайну выехаў, як на сьвята, убраўся, дасьпехі зьзялі на сонцы, шапка з аграфам, каштоўны аграф на плячы трымае кароткі аксамітны плашч.

- Будзе табе яшчэ вайна. Яшчэ пакаштуеш крыві зь ляза. Ды сьпяшацца ў гэтым ня трэба. Вайна сама цябе знойдзе, як і сьмерць сама прыйдзе. Няма чаго іх клікаць без патрэбы.

Тэадор, важкі, мажны, выцер рукой пот з ілбу. Добра, што не сьпякотна гэтай парой. Але ж мякка як, прыгожа! І сапраўды, сонца пачало ўзыходзіць, і яго яшчэ кволыя промні песьцілі зямлю. Неба зазьзяла блакітам, амытым начной прахалодай.

Міхась стрымаў цяжкога чорнага жарабца. Малады, гарачы, нядаўна куплены, але ж добра аб’езжаны і бываўшы ў бойках, ён быццам бы адчуваў, што прыехалі яны сюды ня проста так, што наперадзе чакае нешта, да чаго ён быў звыклы, прывучаны несьціся па полю, ірваць зубамі і біць капытамі, дапамагаючы гаспадару разіць ворага. Але ж гаспадар яго марудзіў, чаму – каню было незразумела, і таму ён нерваваўся, злаваўся, ціхенька фыркаў, бразгаючы вудзілам.

- Цішэй, цішэй. Не гуляй. Яшчэ нагуляешся. Конь, пачуўшы яго голас, стаў сьмірна, толькі крыху таньчыў на месцы. Другі Міхал, Бучацкі, на вялікім рудым кані, сам аграменны, як дуб, аглядаў зацікаўлена замак.

- Якая грамада! Магутны! – нарэшце вымавіў ён. – Яго і за год ня возьмеш.

- Возьмем за хвіліну, - падміргнуў яму Грыцько. – Зараз убачыш.

З гэтымі яго словамі брама расчынілася, і насустрач ім выехаў Ян. Сівавусы, сівабароды, доўгія белыя валасы разьвіваюцца. Прышпорыў каня, нацягнуў лейцы, і стаў перад войскам, як укапаны – мажны, вялікі, быццам бы ня вершнік, а каменная выява героя-волата, абаронцы шэрай цьвярдыні за яго сьпіной. Годная, ліцьвінская кроў, нос арліны, позірк як у зубра, з-пад шырокага ілбу, велічны, уладны. Даўгірд служыў яшчэ Вітаўту, ад яго атрымаў і гэтае староства ў Камянцы, як узнагароду за вернасьць. Былы княжы маршалак, ён трымаў у замку ладна

ўзброены, вялікі гарнізон, бездакорна нёс сваю службу гаспадару. Убачыўшы польскія харугві, нахмурыў бровы.

- Што прывяло сюды войска кароннае? – вымавіў. Голас яго гучэў сувора, нізка. Густое рэха пракацілася, і звалілася ў роў, атачаючы мост.

- Гора, Ян. Страшное гора, якое напаткала нас усіх.

Міхась выехаў наперад. Ваяры за яго сьпіной згрудзіліся, чакалі.

Цішыня, і толькі подых людзей, храп коней, і птушка надрываецца недзе ў даліне пад мастом, вітае ранак.

- Што за гора, пан Міхал? – Ян накіраваў да яго каня, і стаў насупраць. – Кажы ж хутчэй, не марудзь. Не тамі маё старое сэрца.

Міхась маўчаў.

- Цяжка і мне казаць пра гэта, - нарэшце вымавіў ён.

- Ці ўсё добра з князям? – Ян уперыў у яго пранізьлівыя шэрыя вочы.

- Сталі мы сіратамі, Ян. Вялікі наш князь, айцец наш, родны наш бацька князь Вітольд, памёр.

Спыніўся Ян, гледзячы на Міхася. Вільгаць заслала яго вочы, але ж стары ваяр утрымаўся. Толькі апусьціў галаву, і зьняў зь яе шапку. Шапкі паздымалі і астатнія, усё войска агаліла галовы.

- Як то адбылося? – толькі запытаў ён.

- Сьмерць яго напаткала хутка. Ня мучыўся і не хварэў. Злыя языкі кажуць, зваліўся князь з каня на паляваньні, ды ты ім ня вер. Забіў князя час, ня вытрымала цяжару яго сэрца. Мірна адышоў ён у Троках, ды быў пахаваны ў Вільне, у капліцы пад засеньню арханёльскае крылаў Міхаіла, побач з Аннай, яго любай жонкай.

Міхась спачувальна глядзеў на яго. Здавалася, што на плечы старога ваяра накінула яшчэ зь дзясятак год. Туга накрыла яго, як жалобны плашч, і пад яе цяжарам яго плечы апусьціліся.

Па нябачнаму знаку Тэадора ваяры акружылі Яна, замкнуўшы кола.

Той узьняў на іх вочы, зьдзіўлена глянуў.

- Апошняя княская воля была перадаць Камянец спадару пану Міхалу Бучацкаму герба Абданк. І я таму сьведка, на што даю сваё уласнае слова.

Міхась накіраваў каня, і стаў побач з ваяром.

- Час прыйшоў, пан Ян, - ціха вымавіў ён. – Пусьці нас у горад, не замінай.

Ян са зьдзіўленьнем узняў на яго вочы.

– Потым растлумачу. Толькі вер мне. Справы дрэнныя на нашай зямлі. Вораг захапіў уладу. Не перашкаджай, прашу. Так трэба. Загад Ягайлы з Жыгімонтам. Лёс Літвы вырашаецца тут. Ад цябе залежыць.

Ян глядзеў на яго. У вачах старога смутак зьмяніўся змрокам, які, здаецца, узьняўся глыбока зь нетраў яго душы.

- А чаму ты з Каронай, Міхал? Дзе войска літоўскае? – нарэшце запытаў ён.

- Я – войска літоўскае. Голас Міхася, глухі, пагрозны, абваліўся камянём з маста.

– Нямнога верных засталося, нямнога тых, хто разумее. Сьвідрыгайла цяпер за князя. На яго бок перайшло дужа шмат тых, хто ня бачыць далей свайго носу. Мы проста зойдзем у горад, і замацуемся ў ім. І будзем чакаць загаду.

- Загаду ад Кароны? – Ян з сумненьнем паглядзеў на яго. Ссунуў бровы.

- Ад Кароны, Ян. Ты ж усё ведаеш. Мы пабраныя з Каронай хаўрусам крапчэйшым, чым малжонак з малжонкай, і цяпер ня час разрываць яго, а час умацоўваць. Але не каб пазбыцца волі, ды каб не згубіць яе. Сьвідрыгайла, апантаны прагай уласнае ўлады і крыўдай, якую ён здаўна насіў на грудзях, прыгрэтую, як зьмяя, марыць разарваць гэты зьвяз, і валадарыць адзін, самаўласна, з дапамогай Маскоўскага княства, на якое ён пазірае, як на паплечніка ў тым, каб адарваць Літву ад Польшчы, а насамрэч – разарваць яе, зрабіўшы лёгкай здабычай для навакольных ваўкоў. Ён узрушыў і Ноўгарад, і тэўтонаў ізноў узьніме, і ў чэшскія землі ён запусьціў руку, усё – супраціў Кароны і касьцёла, як ён прадстаўляе сабе. Насамрэч жа ён піша і папежу, і ўсім вакол, і ўсім ілжэ, бо хлусьня яму – як паветра. Безь яе атруты ён не адчувае сябе жывым. Ілжэ сам сабе, ілжэ ўсім, толькі б утрымацца ва ўладзе, ды пацешыць сваю гардыню. Злачынны дурань, хоць і князь, і Ягайлаў брат. Ты ж ведаеш, як Вітаўт ставіўся да яго, Ян. І ты знаеш, што б ён зараз табе загадаў. У імя нябожчыка-князя, у імя яго апошняе волі – не дапусьціць ганьбы і распаду дзяржавы, я прашу цябе, мы ўсе просім цябе – князі рускія, галіцкія, падольскія, і князі каронныя, усе мы сабраліся тут, і я, ад імя Ягайлы і Жыгімонта, сына Кейстута, просім – не вымушай нас браць замак сілай. Прымі нас, як гасьцінны гаспадар запрашае сваіх гасьцей, і на месцы ты даведаешся болей. Ты пачуеш такія рэчы, ад якіх, ня будзь ты сівы, ты б за раз пасівеў.

Міхась прама глядзеў на яго, яго вялікая рука лягла на шыю каня Яна, крэпка трымаючы яго лейцы. Незаўважна вастрыі копій накіраваліся на сівавусага вершніка. Усе вакол чакалі.

- Імём Вітаўта! – голас Міхася, уладны, нізкі, загадваў. Але ж вочы прасілі.

- Добра. Я ня буду змагацца з імём таго, каго я ўшаноўваў другім пасьля Пана Бога. Імя майго ўладара – імя для мяне сьвятое. Калі ты, Міхал, кажаш, што такая была воля Князя, то я не магу яму пярэчыць.

Імём Вітаўта я адчыню вам браму. Запрашаю вас у Камянец, спадарства. З гэтымі словамі Ян павярнуўся да вежы, на якой вартавыя чакалі напружана, намагаючыся разбачыць, што

робіцца ўнізе, і пачуць, аб чым ідзе гаворка.

Ён махнуў ім рукой, і паскочыў праз мост у шчыльным аточаньні падольскага панства, за якім пацягнуліся астатнія жаўнеры.

Хутка брама Камянецкага замка зачынілася за імі, і на масту ізноў стала ціха. Пыл асеў, сонца ўзышло, і толькі салавей гучна заліваўся недзе ў галінах дрэваў у лагчыне пад мастом, вітаючы надыйшоўшы дзень.

Такім чынам, пры падтрымке Камянца, яны здолелі ўзяць і астатнія крэпасьці – Смотрыч, Чырвонаград, Скалу, Бакоту, ды іньшыя. Не давялося павваяваць, не дастаў Міхал Бучацкі сваёй улюбёнае шаблі, не пагуляў Ян Грыцько ў чыстым полі – самі адчынялі гарады-крэпасьці дзьверы, і ня выпаў яшчэ і сьнег, як усё Падольле дабравольна перайшло пад уладу Кароны.

І вось праз шмат дзён, калі ўжо і восень кацілася на зіму, перад імі шырока і роўна раськінулася Валынь. Луцкі замак стаяў пагрозна, авяваемы лістападнымі вятрамі. Неба было шэрым, нізкім, дарогі асьлізьлі ад гліны. Войска, стомленае пераходам, прамоклае, спынілася перад высокімі сьцянамі. Здаецца, зусім нядаўна яны піравалі тут, палявалі на зуброў у навакольлі, і горад гудзеў шматгалосьсем моваў і мільгацеў стракатым убраньнем гасьцей, але ж цяпер іх сустрэла цішыня. Луцк не адчыніў браму. Войска згрудзілася перад сьцянамі, зь якіх на іх пагрозна глядзелі ваяры.

- Адчыняйце, войска кароннае па загаду самога караля Ўладзіслава Ягеллы! – Тэадор крыкнуў гучна, але ж адказу не было. Нарэшце на сьцяне зьявіўся невысокі, мажны чалавек, шыракаплечы, апрануты ў раскошнае адзеньне – футравы плашч, чырвоны доўгі жупан. Стаў прама, разьвярнуўся грудзямі да ваяроў унізе.

- Нічога ня ведаю, мне кароль нічога не казаў, ліста не прысылаў, а калі паны з ласкі Божае вырашылі мяне наведаць, то ў мяне нічога для іх не гатова. Усё што было, яшчэ пры Вітаўце нябожчыку паелі, папілі, а новага не напасьлі. Так што разварочвайцеся, дарагія госьці, і язжайце да хаты, шаноўнае

панства. Гладкае вам дарогі, і ног не замачыць! У адказ на сьцянах зарагаталі.

- Што рабіць будзем? – запытаў Грыцько.

- Станем лагерам, і падумаем. Старэйшы Міхал разьвярнуў каня. Малодшы незадаволенна выцягнуў шаблю.

- Я б іх павучыў, пся крэў! – горача вымавіў ён.

- Не сьпяшайся. Яшчэ павучыш. Міхась палажыў руку яму на плячо. Хутка недалёк ад сьценаў запалалі вагні лагеру.

Ноч зацягнула марозцам лужыны, падсушыла гразь. Ясныя, буйныя зоркі высыпалі на небе, як гарох.

Жаўнеры грэліся ля вагню, сушылі абутак, у вялікіх катлах варылася ежа. Сьцены замка, пагрозныя, магутныя, узвышаліся на адлегласьці, негасьцінна пазіраючы на іх – сваіх, якія цяпер апынуліся чужынцамі.

- Не здасі Юрша гораду, - пакачаў галавой стары Бучацкі.

Малодшы з запалам адказаў:

- Калі не здасі, то самі возьмем. У нас добрае войска, а ў іх і тысячы няма.

- А сьцены ты бачыў? – Грыцько ўськінуў брыво. – Гэткі ты прыткі, хлопча. А давай, мы цябе туды закінем, і ты там усіх паваюеш, а потым нам дзьверы адчыніш. І ўсяго справаў.

Збоч пачуліся сьмяшкі. Міхал-малодшы горда глянуў вакол, уськінуў галаву.

- Дык што, назад пойдзем? Калі такое было, каб Кароннае войска адступала бяз бою?

- Жадаеш з боем адступіць? – Тэадор паморшчыўся. – Бываюць выпадкі, калі сваечасовая рэтырада – адзінае найлепшае выйсьце. Гэта і войска захаваць дапамагае, і час набыць для

будучага посьпеху. Мы на аблогу і бой наогул не разьлічвалі. Гэта было б супраціў усіх законаў і Кароны і Княства. Толькі дабравольная перадача ключэй і пасадаў з нагоды надзвычайных абставінаў. Дагэтуль усе фартэцыі мірна адчынялі нам браму. Але ж вось, Луцк заўпарціўся.

- Чую я тут Сьвідрыгайлаў сьлед. Міхал-старэйшы пакачаў галавой. – Ня проста так Юрша не жадае адчыніць нам браму. Гэта, браты, відавочная здрада. Ды, па праўдзе, у чым тут здрада? Сьвідрыгайла ж яму князь. І землі гэтыя не належаць Кароне. Таму, мяркую, на Валыні прыйдзецца нам туга. Тут усё і адбудзецца, калі пачнецца міжусобіца.

- Што ж рабіць? – пачуліся галасы.

- Пачакаймо. Чорны прыйдзе, распавесьць. З гэтымі яго словамі полаг палаткі адкінуўся, і Міхась увайшоў ўнутр, прыгнуўшыся. Зьняў пальчаткі, скінуў футравы плашч, і сеў ля вагню жароўні. Працягнуў да полымя рукі.

- Ну, што? – запыталі галасы.

Ён падыйшоў да сьцяны замка, і пусьціў стралу. Адыйшоў у бок, і стаў чакаць. Чакаць, на шчасьце, прыйшлося ня доўга. Праз гадзіну ці меней скрыты праход у сьцяне расчыніўся, і праз яго выйшаў Станка Юрша. Міхась аддяліўся ад дрэва, і зрабіў крок наперад.

Стараста падыйшоў да яго, працягнуў руку. Яны паціснулі адзін аднаму далоні, і сталі насупраць.

- Чаму не пускаеш нас, Станка? – запытаў Міхась. – Чаму ўпарцішся?

- А чаго мне вас пускаць? – на твары Юршы ні водны мускул ня дрыгнуў. – Не хачу. Чуў я пра тое, як вы сюды дабіраліся. Ва ўсіх крэпасьцях памянялі намесьнікаў, стараст. Сваіх пасадзілі, ляхаў. Не аддам ляхам гораду. Луцк быў, ёсьць, і будзе літоўскім.

- А пэўна, ёсьць розьніца? – хацелася раптам адказаць Міхасю,

ды ён стрымаўся.

- Ягайлаў загад, - коратка адказаў ён. – Кароль ведае болей, чым мы з табой, і хоць я і ня ведаю ўсяго, што ведае ён, ды я ведаю болей за цябе. І таму на тваім месцы я б здаў горад, і спакойна чакаў бы новай пасады. Тых, хто лаяльны Кароне, Ягайла добра ўзнагароджвае. Гэта па-першае. Па-другое, у нас ёсьць пэўныя весткі аб плянах … Вялікага князя. Цяпер ён з пагардай вымаўляў гэты тытул.

І пляны гэтыя – не на карысьць дзяржаве.

- Я плянаў ніякіх ня ведаю, але ж нават і калі б Княства разарвала хаўрус з Каронай, то пусьць і так. Юрша пацiснуў плячыма. – На маю думку, ён наогул не патрэбны. Час зьмяніўся, і Арда губляе сваю моц. Калі мы …

Тут ён замаўчаў, рэзка. Быццам бы словы апяклі яго вусны.

- Што ты сказаў? Арда? Міхась глядзеў на яго бяз злосьці, крыху стомлена. З жалем.

- Так вось якія пляны вы выношваеце. Што ж. Нічога дзіўнага тут няма. Ужо шмат год той, хто нейкім дзівам праскочыў на дужа вялікую для памера яго душы пасаду, марыць аб адным – прадацца на Ўсход.

- Не прадацца, а з'яднацца. Юрша ўзьняў твар, выставіўшы наперад кароткую сьветлую бараду. Невялікія вочкі яго, вострыя, сталі яшчэ вузейшымі. – І тады мы створым такую моц, што і Карона будзе нашай, і многа хто яшчэ. А там, глядзіш, і да Рыму дойдзем. Гэта ты, і такія як ты, нічога не разумееце. За што вы трымаецеся? За спарахнелага папежа? Жыгімонта-немца, які даўно ўжо прадаўся д'яблу? Прыгрэлі жыдоў, набудавалі лацінскіх цэркваў, адчынілі дзьверы манаскім ордэнам – рымскім псам, сталі і самі псамі, халуямі Кароны, а праз яе і Імперыі, ва ўсім глядзіце на Папежа, безь яго дазволу і чыхнуць нельга. Нашая сьвятая вера, вось за што трэба трымацца! Мы пабудуем трэцьці Рым, сапраўдны, па боскім правілам. Будзем кіраваць і загадваць мы, а не д'яблы з Ватыкану. Чэхі ня сталі цярпець, і мы ня будзем. Самі будзем

маліцца і ўшаноўваць Бога так, як нам трэба, на роднай мове, як дзяды, па-старому звычаю. А вас хачу папярэдзіць. Хутка вы згубіце ўсё, як згубілі веру, і незалежнасьць, і вашыя пасады, і землі, і звычаі. Праклятыя лацінцы адбяруць у вас і душу, каб аддаць яе д’яблу на пакуты. Але ж мы не здадзімся. Мы сваёй дзяржавай кіраваць будзем самі, і ніякая Карона нам не ўказ.

- Усё гэта я чуў шмат разоў. Міхась нахінуў галаву. – Добра. Уявім, што я табе паверыў, і астатнія, хто трымаюцца Кароны і Ўніі, таксама. Мы спынім адносіны зь ляхамі, выйдзем з-пад улады Ягайлы, разарвем Унію. У гэты час тэўтоны ўдараць па Кароне, а мы – мы застанемся адны. Ды ці надоўга? Наступным крокам, памяні маё слова, будзе іньшы хаўрус. І гэта будзе хаўрус з Масквой. Аднак не такі, як мы маем зараз з Каронай. Перад тым, як ажаніцца зь Ядзьвігай, Ягайла хацеў ажаніцца з Соф’яй, дачкой Дзьмітрыя Данскога, але ж Масква выдзьвінула ўмовы – Княства прымае маскоўскага князя за галоўнага, і такім чынам становіцца васалам Масквы, як нейкі там Уладзімір, ці Суздаль. Ці магчыма гэта, каб дзяржава, вялікая, роўных якой мала і ў сьвеце, раптам забіла б сама сябе, стаўшы васалам ардынскага ўлуса? Ягайла, кажуць, толькі рассьмяяўся ў адказ. Бо ж і пакрыўдзіцца на гэта было нельга. Чаму зьвяртаць увагу на словы вар’ятаў? Адразу пасьля гэтага ён пабраўся шлюбам зь Ядзьвігай, і праз яе – з Каронай, якая, шчыра кажучы, далучылася да нас, а не мы да яе, бо ж Ягайла-літовец стаў польскім крулем, а не лях – літоўскім князем. Кажуць, у Маскве былі дужа не давольныя, ды што нам тая Масква?

- Масква набірае моц, і я мяркую, што лепей трымацца яе, чым быць яе ворагам. Тым больш, што яны – праваслаўныя.

- Якія лічаць цябе ерэтыкам-ліцьвінам. Ці даўно праваслаўе ў той частцы Русі мае права слова, не папрасіўшы перш дазволу ў ардынцаў, якія прынялі веру Магамету? І якая сапраўды галоўная вера там, у бок каго ты глядзіш? Тады чаму не туркі? Зачым табе крыж наогул?

- Мы падтрымаем веру рускую, і разам зрушым Арду, якая ўжо рассыпаецца на вачах. І тады..

- Трэці Рым. Гэта я ўжо чуў. Я разумею. Але ж, прабач, усё, што ты кажаш, можа і было б цікава, калі б гэта не было здрадай. Здрадай дзяржаве, дзякуючы якой мы перамаглі тэўтонаў. Масква ня ўдзельнічала ў Грунвальдзе. Масква ня стала супраціў магаметанаў і манголаў. Яна скарылася ім, і апранула на плечы парчовы халат, а на галаву – татарскі шэлом. Я – таксама хрысьціянін, як і ты. І хоць я і веры лацінскай, і пёс, і ерэтык, і д’ябал ва плоці, але ж Хрысту я не здраджваў, і здраджваць ня буду. Я буду трымацца той веры, у якую я хрысьціўся, і якую лічу шчырай і правільнай, і найлепшай для маёй душы. Аднак і вашу веру я паважаю. Таму, і нават каб захаваць сапраўдную, чыстую праваслаўную веру, як ты кажаш, ад дзядоў, я ніколі не саступлю Маскве. Я сьцяной стану, плячом сваім захіну гэтую зямлю, мячом сваім пастаўлю ім загароджу, і ніхто, чуеш, ніхто з таго боку ня войдзе сюды як гаспадар. Толькі як госьць, як сябар, бо я шаную вузы сяброўства і братэрства. Аднак усялякі, хто паўстане супраціў утвораных Вітаўтам хаўрусаў для мяне будзе ворагам, якога я зьнішчу. Можаш перадаць гэта Сьвідрыгайле, калі ён наступным разам прыедзе да цябе. А я мяркую, што гэта будзе хутка. Калі ён хоча разбурыць дзяржаву, хай гатуецца да вайны. Мы не пацерпім здрадніка на троне, які намагаецца прадаць нас у ардынскую няволю. Не для таго я ўсё сваё жыцьцё біў магаметанаў, стрымліваў турэцкія орды, каб легчы пад Арду мангольскую, хоць і ўвасобленую Масквой.

І нават калі Маскве нейкім чынам удасца выкараскацца з-пад гніючай тушы Арды, то, павер, яна ня будзе нечым іньшым, адрозьніваючымся ад свайго былога гаспадара. Гэтая дзяржава сталела і расла пад мангольскім уплывам, і ўсё у ёй створана ардынскім чынам. І, мяркую, і ў веры яе не засталося шмат сапраўднага хрысьціянскага духу. Аднак гэта ўжо ня мне судзіць, і ня мне каштаваць гэтага пірага. Хай жывуць, як хочуць. Нас яны не атрымаюць.

- Усё, што ты сказаў, мае рацыю. Юрша паціснуў плячыма. – Ты ніколі ня быў дурны, і я заўсёды слухаў цябе з павагай, бо ўсе твае саветы былі добрымі. Аднак я яшчэ пачакаю. Я не магу так адразу адчыніць вам дзьверы, бо мае людзі ўсе настроены супраціў ляхаў, Кароны, і, шчыра кажучы, літоўцаў. Мы –

русіны, і месца нашае з Русьсю. Так мы лічым. Можа, калісьці мы і ўтворым дзяржаву, якая аб'яднае ўсех праваслаўных рускае крыві. Але ж наконт таго, што адбываецца зараз, ты правы. Ня ведаю, якія пляны ў Сьвідрыгайлы. Гаворыць ён прыгожа.

Тут Станко ізноў спыніўся.

- Хлусіць, упэўніваю цябе. Усё, што ён кажа, хлусьня. Ад першага і да апошняга слова. Да таго ж, ён – дурань, і дурань шчыры. Можа, ён і бачыць сябе адзіным уладаром асобнае вольнае Літвы і Русі, ды ён памыляецца. Тыя, да каго ён зараз зьвяртаецца за дапамогай, дадуць яму разарваць хаўрус з Каронай, а потым падзеляць і Літву. Калі б ты адчыніў нам браму, было б добра. І, найперш за ўсё, табе. Бо мы ўсё роўна пераможам.

- Не магу. Я ж сказаў, мае людзі супраць, і ўвесь край стаіць за Сьвідрыгайлу. Нават калі б мы і ўпусьцілі вас, то гэты горад быў бы ўзяты, як толькі б сышло войска. І вашыя людзі былі б выразаны. Таму я не магу. Ва ўсякім чыне, цяпер.

Юрша глядзеў на Міхася спакойна, у яго вачах не было злосьці ці крыўды. – Я проста ўлічваю абставіны, - дадаў ён.

- Добра, калі так, і ты сапраўды ня можаш, я разумею. Міхась кіўнуў. – Але ж якое рашэньне не было б прынята намі зараз, памятай тое, што я табе сказаў. Ты не дурны хлопец, Станка. Ён хлопнуў старасту па плячу.

- Мяркую, мы з табой яшчэ вып'ем разам у Вільні, на нашай сапраўднай роднай зямлі.

- Хто ведае, дзе нам прыйдзейцца з табой выпіць, Чорны. Станко ўсьміхнуўся. – Спадзяюся, што гэта будзе ня пекла. А іньшыя месцы мне ўсе даспадобы.

- Ён не здасі горад, - нарэшце вымавіў Міхась. Галасы вакол загулі.

- І я лічу ня вартым і шкодным працягваць аблогу ці намагацца ўзяць горад сілай. Перш за ўсё, мы ня маем ні прыладаў, ні

прыпасаў, ні людзей. Нашае войска ня зможа трымаць аблогу патрэбны час, а яна можа заняць і некалькі месяцаў. Акрамя таго, усё, што даручыў мне Ягайла, выканана. Мы можам спакойна вяртацца ў Кракаў, і гэтыя некалькі мяцежных крэпасьцяў нічога ня значаць для Кароны. Што маглі, мы забралі бяз бою, а тыя, хто хочуць змагацца – што ж, так абазначацца межы вайны, якая не за гарамі. Нам патрэбна рыхтавацца да сапраўднай, вялікай бойкі. Але ж не паміж Княствам і Каронай, а паміж гасударствам, створаным Уніяй, і мяцежнікамі, якіх мы ўсё роўна пераможам і сьхілім да парадку. Я хачу, каб вы ўсе разумелі гэта. Сьвідрыгайла – мяцежнік, і ўсе, хто пяройдзе на яго бок, будуць лічыцца такімі ж злачынцамі. І паступаць зь імі будуць адпаведна, ад пазбаўленьня зямель і маёмасьці да пазбаўленьня галавы.

- Чуеце, панства? – ён узьняў вочы, і абвёў імі прысутных. Усе вакол заціхлі. Увесь гэты час ён не выпячваў сваю ўладу, сваю моц і месца, якое ён займаў пры двары як Кароны, так і Княства, трымаўся нават і сьціпла, дазваляючы кіраваць прадстаўнікам славутых радоў. Але ж цяпер яны зразумелі, хто тут гаспадар і галоўны. Усялякі, хто зараз пойдзе супраціў яго слова, падпіша сабе сьмяротны прыгавор, паставіць сябе па-за законам і стане злачынцам і ворагам дзяржавы, якая зараз увасоблена для іх Ягайлай. Бо ж вялікі князь літоўскі здрадзіў, і Літва апынулася без галавы.

- І хто, калі не Сьвідрыгайла, займе гэтую пачэсную пасаду? – думка гэтая заварушылася ў многіх.

- Мы разумеем, пан Міхал, - прымірэньча вымавіў Тэадор. – Раніцой мы паўстанем, і адыдзем. Накіруемся назад, у Карону, і там будзем чакаць далейшых загадаў нашага Богам пастаўленага над намі Круля.

Бо ж мы за Карону, і за Вялікае Княства, за веру, вольнасьць, і годнасьць.

- За годнасьць! – выкрыкнула разам мноства галасоў. – За Карону! За Княства! За перамогу!

Раніцой яны хутка сабраліся, і пад зьдзіўленымі і радаснымі поглядамі ваяроў зь вежаў і сьценаў стройнымі шыхтамі пайшлі прэч ад Луцка па дарозе – назад, на Падольле, і праз яго – у Кракаў. Доўгая, складаная місія некалькіх месяцаў скончылася пасьпяхова. Мяжа была дасягнута і абазначана, і яны ішлі дамоў. Аднак, каб хутка вярнуцца, разумеў ён.

Глава 4: Адна

Яна яшчэ адчувала яго рукі вакол сябе, калі ён абдымаў яе, перад тым, як сесьці на каня. Колькі разоў гэта адбывалася, ды ўсё ж, кожны раз, як і раней, баліць яе сэрца. Безь яго яе жыцьцё спынялася. Надыходзіла чаканьне. Яго вусны яшчэ ляжалі на яе губах, вочы пазіралі ў вочы. Хаця ўжо прайшоў месяц, і ішоў другі. Яны набылі дом у Кракаве – вялікі, уласны. Са слугамі, чэлядзю, дзе дастаткова было месца і для яе, і для дзяцей, і аховы. Але ж цяпер нікога не было побач зь ёй, каго яна ведала. Толькі Абель, пастарэўшы, зь сівымі ніткамі на скронях, з вачыма яшчэ больш сумнымі, вялікімі, як вазёры, у якіх плёскалася ўся туга яго гаротнага народу. З Гішпаніі да іх далятталі сумныя весткі – шмат габрэяў было закатавана, пазбаўлена маёмасьці, і сярод іх апынуліся і некалькі зь яго радзіны.

Ядзьвіга стала ўжо зусім дзяўчынай, таньчыла на балях. Іван жа быў ладным хлопцам, ужо нават і не падлетак – прыгожы, высокі юнак, якому споўнілася амаль пятнаццаць гадоў. Яшчэ год, і ён зможа ўступіць у Кароннае войска. Яна баялася гэтага, як самое сьмерці, якой, насамрэч, яна зусім не баялася. Але ж згубіць сына – гэта для яе было немагчыма, жахам найстрашнейшым, які толькі мог быць у сьвеце. Яна бачыла, як лёгка вакол гінуць людзі. Як часта жанчыны апранаюць жалобныя ўбраньні, хаваючы сыноў і іх бацькоў, і ёй станавілася жудасна балюча ў самым яе сэрцы. Яе сэрца цякло крывёю, як працінутае сэрца Марыі, якое яна насіла ў выглядзе брошы на грудзях – зьзяючае, залатое, рубінавае, з залатымі стрэламі і пярлінамі, і якое раз-пораз накрывала рукою.

Так прайшоў у самоце адзін месяц, і надыйшоў другі. І другі хутка мінуў. Нарэшце, восень амаль пераўтварылася ў зіму. Яна стаяла ля вакна, кутаючыся ў футра - у вялікам каменным доме было халаднавата.

- А можа, праехацца? Наведаць сабор? – падумала яна.

Як бы ў адказ на яе думкі, зь нізу пачуліся галасы.

Хутка на парозе ўзьнік слуга.

– Панна, вас запрашае чалавек. Кажа, ён даўно ведае вас, і ён прыбыў здалёк. З-пад самага мора. Высокі такі, важкі, вялікі. Імя не называе. Запрасіць яго, панна?

Яна абярнулася, і імгненьне глядзела на слугу. Нешта раптам уздрыгнула ў грудзях.

- Здалёк? Ад самага мора? Запрасі. Я зараз спушчуся, Янек.

Слуга сышоў, і яна звыкла схапілася за сэрца - рубінавае, якое раптам стала гарачым пад яе рукой.

Ён стаяў на парозе – высокі, пакрыты сьнегам, вялікі, як гара. Як мядзведзь, што выйшаў зь лясных нетраў, абтрос сьнег, агледзеўся, і цяжка пакульгаў да жытла – грэцца. Гады, здаецца, ня бралі яго, хоць ён і быў значна старэйшы за Міхася, ды ніхто ня даў бы яму яго ўзрост. Здалёк яны маглі б выглядаць і аднагодкамі, ды калі прыглядзецца, то Нікіфар, агромністы, шырэйшы ў грудзях, нагадваючы стары дуб, сышоў бы Міхасю за бацьку. Сапраўды, і бацьку Міхася ён добра ведаў, і Міхася бачыў яшчэ маладым хлопцам, які толькі прыехаў з Францыі, дзе выхоўваўся далёка ад дому. Як перакруцілася жыцьцё, што юнак, якому ён тлумачыў таямніцы дзядоўскае веры, цяпер кіруе лёсамі людзей, і ў яго руках і яго, Нікіфара, лёс, які ён аддаў яму дабравольна. Аддаў праз жанчыну, якая зараз стаяла перад ім, і напалохана глядзела на яго вялікімі шэрымі вачыма. Тут нічога ёй не пагражала, і вакол было поўна слугаў і жаўнераў, што імгненна з’яўляліся па яе загаду. Але ж чаго ў яе так біецца сэрца? Ён адчуваў гэтае калачэньне пад яе сукенкай у цёмны колер брусьніц, што прыхапіла сьнегам. Яе тонкая рука закрывала нешта на грудзях, белых, як той сьнег у лесе, якія ўзьнімаліся, сьціснутыя вузкім ліфам. Здаецца, ён мог бы перахапіць яе адной рукой. Гады ня бралі яе, як і яго. Якія яны падобныя! – раптам працінула яго думка. Ён адчуваў біеньне крыві ў яе жылах, непакой у яе сэрцы, сум і тугу, страх і надзею, якімі поўнілася яе душа, нагадваючая птушку ў вялікай клетцы. Гэта цела было яе клеткай, як і гэты дом, і гэты сусьвет.

- Навошта ён трымае яе тут? – падумалася яму. – Ён жа мог бы падарыць ёй усё, увесь сьвет, што ёсьць вакол, і зямлю, і неба кінуць да яе ног. Аднак ён абраў гэтае заточаньне для сябе і для яе, гэтыя пакуты і боль, і сум, і сьлёзы, і цяжар разьвітаньня, і пыл дарог. – Як жа ён яе кахае, што робіць зь ёй усё гэта? І ці кахае ён яе наогул? Але ж ён бачыў яго вочы тады, у сваім доме, калі ён прыехаў, каб забраць яе. Гэтыя вочы належылі чалавеку, які глядзіць у вочы сваёй сьмерці, стоячы на шыбеніцы ці чакаючы, пакуль меч праціне яго цела. Імгненьне, вось ён, Нікіфар, скажа слова, і сьвет у гэтых вачах памрэ. Ён прайшоў дзеля яе ўвесь сьвет, каб яе знайсьці, вярнуць тое, што згубіў, каб прыціснуць яе да сэрца, і адначасова ён быў гатовы адмовіцца ад яе, аддаць яе яму. І дастаткова было б толькі яго, Нікіфара, слова, і ён бы валодаў гэтай прыгожай жанчынай. Ды ці валодаў бы? Хутчэй, яна б забіла сябе, чым заставацца з тым, хто ёй ня любы. Таго ж, яго вучня яна любіла. Любіла яго болей за жыцьцё, болей за ўсё, болей за сваіх дзяцей, і за самое сябе. Любіла яго, як Бога. Ён быў яе адзіным Богам, адзінай верай. Яна верыла ў яго, і болей – ні ў кога. Як у яго хапае моцы несьці цяжар такой веры, такой любві, што цяжалейшая за сусьвет, хоць і маленькая такая, што болей нагадвае цень, ці анёльскі прывід? Хто яна, гэтая жанчына, якая здольная так узяць, захапіць у палон душу, што тая будзе бачыць толькі яе і яе прыгажосьць, пагарджаючы ўсім астатнім сьветам вакол? І як хапае волі ў яго, у таго, другога, ня кінуць усё, і ня зьехаць куды-небудзь, каб насалоджвацца яе каханьнем у цішыні і спакоі, не рызыкуючы ні сваім, ні яе жыцьцём, а проста жыць, так, як ён любіць, як Нікіфар ведаў, з кнігамі і малюнкамі, з музыкай і малітвай, у размовах з мудрымі сэрцам, перадаючы свае веды вучням так, як Нікіфар калісьці перадаў свае веды яму.

Што гоніць яго кідацца ў бойкі гэтага сьвету? Рызыкаваць і сваім і яе жыцьцём, пэцкацца ў брудзе гэтых гідкіх палацаў, якія нагадваюць вялікі зьмяёўнік, клубкі, што гады ўтвараюць на вясновым сонцы?

Гэтыя дамы, гэты брудны горад, праязджаючы праз які, Нікіфар жадаў заціснуць нос, звыклы да водару жамойцкіх лясоў і сьвежага салёнага паветра. Чаму б яму ня жыць зь ім у лясах? Іх

ніхто б там не дастаў. Лясы Жамойці глухія, дзікія, і нага чалавека ў іх ступае рэдка. Толькі паляўнічы наведвае гушчар, ды старыя прывіды. І багі ходзяць тут, схаваныя ў адзіным месцы, дзе ім дазволена валадарыць, наведваюць свае капішчы, якія надзейна захаваны вернікамі ў такой непраходнай густэчы, і так далёка ад усялякага жытла, што ніхто іх з чужынцаў ня знойдзе. Хай капліцы стаяць на пагорках, багі ж сыдуць у гушчар патаемны, да старых валуноў, сакрытых гаёў, на косы марскія пяшчаныя, якія ведае толькі рыбак ды русалка.

Усё гэта круцілася ў яго галаве, пакуль ён яе чакаў. Калі ж ён убачыў яе, яго галава раптам стала чыстай. І там засталася толькі яна.

Жанчына на імгненьне спынілася, зьнерухомела, нібыта ў нерашучасьці, а потым прайшла яму насустрач, і працягнула руку. Звыкла, жэстам, які быў уласьцівы больш для прыдворнай панны, чым для яе, як ён яе памятаваў.

Ён асьцярожна ўзяў руку, ня ведаючы, што рабіць. Яна, усьміхаючыся, глядзела яму ў вочы. Ён паднёс да вуснаў яе вузкую, тонкую кісьць, на якой паблісквалі пярсьцёнкі, зь мяккай, белай скурай, амаль празрыстай, пад якой у сініх жылках бегла чырвоная кроў. Яго вусны прыцісналіся да яе. Рука была халоднай, нібы лёд, і пахла ад яе нечым салодкім, духмяным, такім, што ў яго стукнула сэрца. Жанчына, якую ён памятаваў, пахла вадой. Лесам. Падарожжам і страхам. Вострым потам напалоханай загнанай аляніхі, якая дрыжэла, гледзячы ў ваўчыныя пашчы. Яе валасы былі зблытаныя, аксамітная сукенка парваная, у плямах сажы і крыві. Яна ледзь стрымлівала сьлёзы, яе вусны дрыжэлі, і вялікія вочы глядзелі на яго з мальбой. Жанчына трымала на руках дзіця. Яе грудзі, пругкія, белыя, не хаваў выраз гарсету, і яна прыціскала да іх хлопчыка, які пільна глядзеў на яго вялікімі чорнымі вачыма. Вачыма таго, іньшага, пад знаёмымі Нікіфару ссунутымі прамымі бровамі. Маці бараніла яго, а ён бараніў яе, закрываючы маленькімі ручкамі ад вялікага, страшнога чалавека, які хоча зрабіць ім нешта злое. Ці – ня хоча? Хлопчык ня быў упэўнены, таму яго вочы неадрыўна вывучалі чужынца. Гэта не яго бацька, а нейкі высокі, такі ж чорнавалосы, мажны

чалавек, які нешта хоча ад іх. Хоча гэтага ад яго маці. А потым хлопчыка забралі, і зьнеслі прэч. І яго маці засталася адна з гэтым незнаёмцам, які цяпер меў над ёй поўную ўладу. Не такую, як ён, Іван, а нейкую нязразумелую, страшную. Раптам Іван падумаў, што ў яго болей ня стала маці, і ціхенька заплакаў. Але ж яго ніхто ня чуў.

- Колькі год, Нікіфар. Яна ізноў ўсьміхнулася мяккімі, ружовымі вуснамі.

- Шмат.

-Як дзеці? Як Іван? – раптам запытаў ён. І голас яго здаўся яму незнаёмым, чужым. Хрыплым.

- Дзеці? Усё добра. Іван зусім вялікі. Хочаш, я паклічу яго? І, не чакаючы адказу, яна пазваніла ў званок. На парозе зьявіўся жвавы, прыткі слуга.

- Пакліч маладога гаспадара, - вымавіла яна. Голас яе быў нягромкім, але ж уладным. Юнак нахінуўся, ловячы кожнае слова.

- Што далажыць, панна?

- Скажы, прыехаў стары сябар пана Міхала. Які ведаў айца з маленства, і хоча праведаць нас.

- Зараз, панна. Слуга імгненна, падбегам, зьнік у пакоях.

Яны ізноў засталіся адны. Яна маўчала. Ён маўчаў. Халоднае, амаль зімовае сьвятло гуляла па яе валах чорным бляскам. Валасы былі як вугаль, каса тоўстая, закручаная вакол галавы. Тонкая белая шыя ледзь трымала гэты цяжар. Вузкія плечы, тонкія, доўгія рукі ляжаць спакойна на пышнай сукенцы. Халодная, незнаёмая, як гэты зімовы дзень. Разам ён адчуў усе гэтыя гады, якія напаткалі іх, паўсталі паміж сучасным і успамінамі. Час лечыць, час загойвае раны. Ці прабачыла яна яго?

- Я не трымаю крыўды, - раптам вымавіла яна. – Я ўсё

прасьціла. Усё засталося ў мінулым. Не чакала ўбачыць вас, пан Нікіфар. Раптам яна зьмяніла тэму.

- Пан?

Памаўчаўшы, яна дадала:

- Цябе.

Між волі ён апусьціўся на калені. Яго вялікая рука ўзяла яе тонкую кісьць, і ізноў прыціснула да вуснаў. Ён перавярнуў яе, і яго губы дакрануліся да яе далоні. Яна ледзь заўважна пацягнула кісьць. Ён не адпускаў яе. Яму было не істотна, ці іх хтосьці ўбачыць, ці, можа, яна закрычыць, і прыбягуць слугі, жаўнеры. Ды хоць усе ваяры з усяго гораду. Ён раськідае іх, як шалёных сабак. А потым ён забярэ яе. Ён прапануе ёй усё – усё сваё лясное царства, і спакой, і абарону, і вялікую, зялёную цішыню. І бязьмежнасьць сіняга мора з густой белай пенай, што шчодра дарыць бурштын, які яна будзе зьбіраць на пяску, гуляючы ўздоўж берагу. І яна народзіць яму дзіця, якое будзе крочыць па пяску зь ёй побач – маленькімі, няўпэўненымі крокамі. І яшчэ адно, якое яна будзе трымаць ля грудзей. Ён ня мог адпусьціць гэтую жанчыну, ня мог сябе стрымаць. Столькі год ён жадаў яе, і цяпер яна была так блізка. Але ж ён баяўся ўзьняць на яе вочы.

- Паехалі са мной, - раптам вымавіў ён. – Што табе заставацца тут? Адной, у гэтых палацах? Ён забыўся на цябе. Яму патрэбная толькі ўлада. Слава. За гэтым ён ганяецца ўсё жыцьцё, як за прывідам, як апантаны ганчак за зайцам. Усё думае, зловіць. Хто ты ля яго? Цень? Са мной ты будзеш каралевай. Нарэшце ён узьняў на яе вочы.

Яны былі чорнымі, пякучымі, як смала. Яго грудзі цяжка ўзьнімаліся.

- Не, Нікіфар. Не паеду. Я – ня цень. Я – яго душа. А ён – мой Пан. Мой адзіны, Гаспадар над маім жыцьцём. Я ніколі не пакіну яго. Што б не адбылося. Нават і ў сьмерці, і пасьля сьмерці я яго не пакіну. Ты ня ведаеш, якая яна прыгожая, яго душа. Яна зьзяе, як сонца. І якое моцнае яго каханьне да мяне.

- Яна прыгожая, і зьзяе, таму што яго душа – гэта ты. Ён усьміхнуўся. – Пашанцавала майму вучню, ня самаму стараннаму, дарэчы.

- І што ты ў ім знайшла, красуня? Ён адчуваў яе пах – блізка, такі вабячы яго. Ахапіць бы яе ногі ў чырвоным аксаміце сукенкі, прыціснуць. Падхапіць яе, узьняць, і аднесьці яе далёка – туды, дзе ніхто іх ня знойдзе. Але ж гэта ўсё мары, і гэта зусім не магчыма. Ці? Калі ускочыць на каня, ён здолее ўвязьці яе далёка, і ніхто яго ня спыніць. І між тым, ён гэтага ня зробіць. Так не хацелася руйнаваць гэты момант надзеі, але ўсё ж прыйшлося. Аднекуль збоч пачуліся крокі. Яна павярнула галаву, і ў той жа час пасунулася ад яго далей.

Ён цяжка ўзьняўся. Як раз тады, калі ў пакой заходзіў высокі малады хлопец. Стройны, чорныя валасы кароткія, па плечы. Тонкі ў таліі, ладна зложаны, перацягнуты тканым поясам па чырвонаму жупану. Ногі ў чорных нагавіцах і высокіх чорных сапагах, рукі белыя, упэўнена рухаюцца, паўтараючы кожны крок. Далонь ляжыць на навершы кароткага кінжалу на поясе. Ён разьвярнуўся да хлапчука. Хлопец спыніўся, і глядзеў на яго. Чысты, сьветлы твар, вялікія вочы, шэрыя, а не чорныя - як у яе. Але ж бровы чорныя, прамыя, як у яго айца. Ён адразу пазнаў яго ў ім. На яго глядзеў малады Міхась, толькі больш вытанчаны, лягчэйшы, са скурай белай, як малако, ня смуглай, як у бацькі, юнак, прыгожы, як дзяўчына, прыгажосьцю нават страшной, палохаючай, такой, што спыняўся подых. У гэтым ён быў у маці. Яе рысы дасканалага твару прычудліва мяшаліся з яго мужнымі, прамымі, рэзкаватымі рысамі, робячы вострыя вуглы больш гладкімі, крыху жаночымі, але ж вагонь, які зьзяў у гэтых сьветлых вачах, жаночым ня быў.

- Маці? – запытальна вымавіў ён, назіраючы, як чужынец цяжка ўзьнімаецца з каленаў. Нейкі дзікун зь лесу, на плячах – ці то футра, ці то ваўчыная скура, на галаве – мядзьвежжая шапка, барада да грудзей, і чорныя, як ноч, густыя валасы. Быццам бы хвойны лес, крыху крануты сьнегам. Чалавек быў ужо не малады, і нечым нагадваў яго бацьку.

- Іван? Ён павярнуўся да яго.

- Памятаеш мяне?

Чалавек быў яму знаёмы, але ж дзе, і як, успомніць ён ня мог. Раптам нейкае пачуцьцё небясьпекі накрыла яго, быццам бы ледзяная хваля, пазбаўляючая паветра. Маці глядзела на яго напалохана, просячы, як яму здалося. Просячы абараніць яе ад гэтага дзіўнага чужынца. Што яму тут трэба? Такіх сапраўдных ліцьвінаў са старых, глухіх лясоў у Кароне ён яшчэ ня бачыў. Выхаваны пры двары, разам зь дзецьмі самых багатых і радавітых шляхціцаў, ён і лес бачыў толькі на паляваньнях. Больш жа бавіў час ў палацах, на балях і турнірах, ды ў навуцы, бо ж гатаваўся стаць сьвятаром. Гэта была яго мара, і так жадала яго маці. Бацька ж не перашкаджаў, толькі ўсьміхаўся.

- Пачакай. Вось споўніцца табе дваццаць адзін год, і рабі што хочаш, - казаў ён. – А раней няма майго блаславеньня. Ды і дурны ты яшчэ, пан Ян, шчыра кажучы. Які зь цябе сьвятар, толькі людзей сьмяшыць. Пажывеш, паслужыш у войску, а потым – выбірай дарогу.

Іван нагадваў маладога, не аб’езжанага жарэбчыка, які ірве цуглі, паўстае на дыбкі, стрыжэ вокам, і скочыць як вецер, толькі вырваўшыся па-за межы стайні. Увесь сьвет адкрыты вакол, толькі абірай свой шлях, ды не марудзь ляцець па яму, спора, разам зь ветрам. Бо столькі ўсяго чакае!

- Маці? Усё добра? Ён зрабіў крок да яе, і стаў побач. Ростам ён апынуўся амаль зь Нікіфара, высокі, хоць і па-юнацку тонкі. Яго вочы пільна глядзелі ў твар госьця.

- Прабачце, паважаны пан. Я ня памятаю вас. Напэўна, я быў дужа малы, калі мы бачыліся. Яго вусны крыху пасунуліся ў вусьмешцы.

- Калі ласка, магу я пачуць вашае шаноўнае імя?

Ён гаварыў, як гаспадар дому, выхаваны, палітычны, але ж жорсткі, ад аднаго руху якога чэлядзь ахопліваў жах.

- Нікіфар. Нікіфар усьміхнуўся ў вусы. – Нікіфар з Жамойці. У адным хрышчэньні – Сьвятаслаў, у другім – Вальдэмар.

Сапраўднае ж маё імя ня ведае ніхто, нават і я, бо чуў я яго так даўно, што і сам на яго забыўся. Ты ж можаш называць мяне, як і ўсе, Нікіфарам. Лічы, што я табе дзед, а айцу твайму – бацька. Бо памятаю яго такім жа маладым, як і ты зараз, нават і маладзейшым, бо ж ты ўжо зусім дзяцюк. Хутка прыйдзе час, запрашу я вас на паляваньне на зубра ці мядзьведзя ў свае лясы. Вось дзе пабачыш ты сапраўдную Ліцьву, і сапраўдае жыцьцё, ня тое, што ў гэтых каменных палацах. Яны табе ў плячах яшчэ ня цесныя?

Іван усьміхнуўся. На гэты раз – шырока.

- Пакуль не заўважаў.

- Хутка будуць. Нікіфар працягнуў рукі, і хлопнуў юнака па плячах.

- Крэпкі які! – зьдзівіўся ён. – А так і ня скажаш.

- Я ня ўвесь час баўлю ў палацах, шаноўны пан Вальдэмар. Іван усьміхнуўся. Дарэчы, можаце мяне зваць Янам.

Нікіфар не пасьпеў нічога адказаць, як раптам да іх даляцеў высокі, чысты, звонкі голас.

- У нас госьці! Мама, а чаму я ня ведаю? Чаму мяне не паклікалі?

У пакой хуткім крокам уляцела, як птушка ў вакно, і спынілася дзяўчо.

І яшчэ раз за гэты дзень у Нікіфара спыніўся подых.

Дзяўчынка, зусім юная, толькі што выйшаўшая зь дзіцячага ўзросту, нагадвала прыгожа расквітнеўшую кветку, тонкую, белую, з залатымі лёгкімі пялёсткамі хвалістых валасоў, якія беглі па аголеных плячах, ледзь прыкрытых футрам.

Яе тонкае цела больш нагадвала анёльскую, а не чалавечую постаць, толькі крылаў за сьпіной не хапала. Тонкая шаўковая белая сукенка струменілася вакол стройнага цела, з маленькімі грудзямі ў нізка адкрытым выразе, якім яшчэ быў не патрэбны

гарсэт. Пухнатае сабалінае футра на яе плячах лашчыла скуру, твар нагадваў малюнак, а вочы былі вялікімі, чорнымі пад тонкімі вугальнымі бровамі. Прамы нос, выразныя вусны, высокія скулы казалі аб характары.

- Дачка? – падумалася Нікіфару. Так, дзяўчына нагадвала Міхася – пранізьлівымі прыгожымі вачыма, чорнымі, пад чорнымі бровамі-крыламі, разнымі нострамі вузкага носу, пухлявымі капрызнымі вуснамі. Але ж на Летыцыю яна падобна не была. Аднак яна назвала яе маці. - Вось дзіва! – падумалася яму.

- Напэўна, нейкая яго радзіна, - вырашыў ён. – Можа, ізноў з Італіі, ці Гішпаніі.

- Адкуль ты, чароўная красуня? – запытаў ён.

Дзяўчынка засаромелася, і падбегла да маці. Схавала твар у яе на плячы, і палахліва паглядала адтуль на незнаёмца.

- Ядзя. Летыцыя ціха кранула яе за плячо.

- Як я цябе вучыла?

- Дзень добры, шаноўны пан! – нясьмела вымавіла дзяўчынка.

- Я – Ядзьвіга Чорная, дачка спадара Міхала Чорнага, славутага рыцара, і князя, маршалка яго мосьці Вялікага князя Вітаўта, і дарадцы яго мосьці Круля Ўладзіслава. Нарэшце яна справілася з хваляваньнем, і сьмела глянула на Нікіфара. Яе шчочкі заірдзеліся.

Нікіфар хацеў ужо адказаць, нахіліўшы галаву, жартаўліва, быццам бы вітаючы важную панну, аднак яго вочы раптам заўважылі нешта ў твары Яна. Юнак глядзеў на дзяўчынку, не хаваючы позірка, і ў гэтым яго позірку была жарсьць.

Сапраўдная, цяжкая, мужчынская, спапяляючая, уладная і прагная, якая пакідае за сабой толькі выпаленую зямлю, ахопленую вагнём гэтай страшной моцы.

Ён яе кахаў, і ён яе жадаў. Гэта стала Нікіфару відавочна.

Дзяўчынка жа, здаецца, не заўважала і ня ведала нічога. У сваім малечым сьне яна жыла, як сонечны праменьчык, які вясёла таньчыць па паверхні вады, па расе на палявых кветках, не кранаючы грэшнае зямлі. Дзяўчынка належыла сьвету анёльскаму, ён жа належыў сьвету зямному. Глядзеў на яе, і ня мог наглядзецца, не адводзячы вачэй, якія палыхалі шалёным полымем. І раптам Нікіфару стала яе шкада, сам ён ня ведаў, чаму.

Ён яшчэ запытаў нешта нязначнае, некалькі ветлівых словаў, якімі абавязваў яго прыход у гэты дом, які, чым болей ён тут знаходзіўся, тым болей станавіўся сагрэтым яе цяплынёй. Цяпер ён ужо не здаваўся яму негасьцінным, халодным, залішне раскошным і пыхлівым панскім палацам. Ён напоўніўся для яго радасьцю, як прыўкрасны велічны сабор напаўняецца гукамі дзівосных сьпеваў, цудам, якое робіцца ўяўленным, учалавечаным, і сыходзіць з-пад яго столі прама ў душу, узьнімаючы яе ў гару, да сьвятла, што ліецца праз недасяжныя, схаваныя далей ад позірку вачаніцы пад стольлю, у нябачным сьвеце, адкуль сыходзіць Бог.

Нешта адпусьціла яго, вызвалілася нешта балючае, сьціснутае ў яго сэрцы. Раскрылася шырока, быццам бы ўвабрала сусьвет, расправіла крылы, і ап'янела ад волі.

Яго каханьне да яе болей не цягнула яго цяжарам да зямлі. Яно яго ўзьнімала. Яму стала лёгка і радасна проста ад таго, што яна была тут, у гэтым сьвеце, зь ім побач. Хай яна і не належыла яму. Гэта было неістотна.

Яна належыла Богу, а праз Яго належыла ўсім, так, як належыць прыгажосьць, на якую ніхто ня мае права ўлады, хоць кожны насалоджваецца ёй. Бо ж боская прыгажосьць - ад Бога, і сьхіляцца перад ёй - адзінае, что сапраўды можа чалавек.

Калі ён пакінуў іх, на вуліцы ішоў сьнег. Сьнег густа кружыў, падаў зь цямнеючага неба, ахутваў бялюткімі карункамі дрэвы і дамы, вазкі, шапкі і плечы, лажыўся на прыхвачаную марозам глебу, танюткі і пяшчотны, не баячыйся загінуць пад нагамі, капытамі і калёсамі.

Яму казалася, што ён у першыню заўважыў сьнег. Як ён прыгожа зьзяе! Які ён чысты, хрусткі, быццам бы бялюткае адзеньне, новае, не кранутае, якое апранаюць перад бойкай ці вялікім сьвятам. Ці - надзяваюць у апошні шлях, да дзядоў, чыі сівыя бароды ён, здаецца, бачыў у аблоках.

Ён пасеў на каня, і паехаў невядома куды па дарозе, якая хутка вывела яго за горад. Праз палі і дрэвы ён ціха рушыў прэч, пакуль раптам яго не спыніў звонкі, пранізьлівы гук. Гук далятаў сьпераду, крыху збоч, і, падпарадкоўваючыся ўладнаму, клічучаму яго звону, ён павярнуў каня на шырокую пратаптаную сьцяжыну. Хутка з-за дрэваў перад ім паказаўся гонкі будынак касьцёлу. Ладны, белы, з вострымі вежамі-шпілямі, нібы карабель, мачты якога паўставалі над хвалямі, набліжаючыся да яго. Ён увайшоў у цяпло. Сіні вечар застаўся звонку, і толькі колькісь сьнегу залятала ў адчыненыя дзьверы. Ён стаў за сьпінамі ў прытворы, і слухаў, як дзівосныя галасы казалі яму аб нечым. Казалі аб Боге, які быў далёка і высока, і так блізка, што кранаў самае яго сэрца. Раптам яно забілася, закалацілася, так, што яму не стала хапаць подыху. Ён схапіўся за калёну, і прытуліўся да яе сьпіной. Сабор кружыўся перад яго вачыма. Яму здалося, што яна стаіць перад ім, і яна сатканая са сьвятла. Мякка яна кранула яго шчаку рукой.

Ён сядзеў на палу, прысланіўшыся сьпіной да калёны. Прытомнасьць паступова вярталася. Ці з-за цяпла, ці з-за недахопу паветра ў яго закружылася галава, і ногі падкасіліся. Гэта было зь ім у першы раз - дзіва! Сьпевы сьціхлі, і па праходу ішоў сьвятар са служкамі, махаў кадзілам, зь якога курэў пахучы дым. Ён устаў, аправіў жупан і сукню, і выйшаў на волю. Кінуў у кружку жменю манетаў, усё, што было ў кішэні, нахінуўся, зачарпнуў рукой шчодра нападаўшага сьнегу, і абцёр твар. Ззаду была цяплыня, духмянасць і прахалода. Сьпераду была ноч, дарога, і хрусткі холад. І гэта было добра. Бог не забраў яго душу, і значыць, ён на нешта яшчэ патрэбны.

Глава 5: Сьвечачка

Сьнег зацягнуў усё вакол бялюткай плёнкай, мароз падсушыў глебу. Яны борзда рухаліся па дарогах, якія ўжо вялі іх землямі Кароны, трымаючыся па левую руку ад ускрайку гор, якія паўставалі на небасьхіле велічэзнымі курганамі-пахаваньнямі старадаўніх волатаў. Недзе ў далечыні вартавыя вежы гутарылі з каршунамі, і нізкія сьнегавыя аблокі лажыліся на іх, накрываючы мяккай коўдрай. Усё, што яны хацелі, яны зрабілі, і везьлі каралю добрыя весткі. Міхал Бучацкі застаўся ў Камянцы, частку людзей з новымі намесьнікамі пакінулі ў іньшых крэпасьцях. Ён з Тэадорам, Янам і малодшым Міхалам скочыў побач. Яны гналі каней, сьпяшаліся, і ўвесь пуць ехалі моўчкі, не было на размовы ні часу, ні жаданьня. Калі-некалі на прывалах успаміналі дом, агульных знаёмых, абмяркоўвалі нязначныя падзеі. Вялікіх рэчаў ніхто кранаць не хацеў. Усе разумелі – будзе вайна, бо ж Сьвідрыгайла не пакіне іх крок без адказу. Але ж дзе, і калі, тое яны ўявіць не маглі. Меркавалі, што, пазнаўшы пра так званы захоп фартэцыяў, самаабраны вялікі князь са таварышы накіруецца на Падольле, каб адбіць замкі ў Кароны. Але ж якім чынам і калі, сказаць было складана. Бо ж для гэтага трэба сабраць рушаньне, што патрабуе часу, дастатковае, каб распачаць аблогу, а колькасць крэпасьцей, перайшоўшых у рукі Кароны, была немалая.

Аднак таго, што насамрэч адбылося, і аб чым яны даведаліся адразу па вяртаньні дамоў, калі ўжо набліжаліся да Кракава, яны зусім не чакалі. Нават і ўявіць такое не маглі. Здаецца, што падзеі, якія адбыліся сорак год таму, ізноў вярнуліся ў нейкім дзіўным адлюстраваньні. Бо ў няволі на гэты раз апынуўся Ягайла.

Разгублена яны слухалі навіну, якую перадаў ім прыскакаўшы насустрач невялікі патрульны атрад.

Даведаўшыся аб тым, што здарылася, Сьвідрыгайла зусім звар’яцеў.

- За бараду круля таскаў! – распавядаў старэйшы з ваяроў, таропячы вочы. – Крычэў нема! Сьліной брызгаў, думалі – памрэ.

- Хоць бы памёр, - змрочна вымавіў Тэадор. - Прабач мяне, Госпадзі, што жадаю такога хрысьціянскай душы.

- Не памрэ гэты нелюдзь так хутка. Ян сплюнуў. – Ён яшчэ нас павыпрабоўвае. - Яму, пэўна, чорт дапамагае, а ня Бог. Міхал? Як лічыш? Чорт, ці бог дапамагае Сьвідрыгайле?

- Думаю, што ніхто яму не дапамагае. У кожнага на зямлі свой лёс, і свая воля. Канешне, Бог можа яго забраць да часу, ды такім чынам, мяркую, ён праз яго выпрабоўвае нас. Правярае, наколькі мы гатовыя трымаць гэтую зямлю, ці крэпкія нашыя рукі, ці добра мы баронім яе - і ад чужых, і ад сваіх.

Бог заўсёды выпрабоўвае, нашая ж справа – цярпець і трываць, і рабіць па яго волі. Паколькі Бог паставіў над намі законнага караля, і дазволіў Ліцьве далучыцца да Кароны, боская воля на што была пацьверджана праз нашую агульгную перамогу над тэўтонамі, то зараз наш прамы абавязак – вызваліць караля, і гатавацца да вайны, якая пачнецца адразу, як растае сьнег.

Міхась сядзеў на зьнятым з каня сядле, вакол распалажылася астатняя шляхта. Увесь важны парадак з шанаваньнем чыноў ды знатнасьці, зь якога пачынаўся паход, пад канец зьмяшаўся, войска было стомленае, усе хацелі дабрацца дамоў да халадоў, бо ж начаваць зімой у сьнезе не падабалася нікому. Сядзелі, згрудзіўшыся, ля вялікага кастру, грэлі рукі, жарылі мяса, якое здолелі здабыць у навакольлі. Сяляне пазьбягалі ў горы, пахавалі там быдла, бо ж нікому не хацелася на зіму гледзячы карміць кароннае войска. Нават і на землях каронных даводзілася рабаваць, каб пракарміцца. Наперадзе было яшчэ два дні дарогі, ня меней. Вершнікі, якія прыскакалі без абозу, нічым асаблівым парадаваць не маглі, ні жываты, ні душу.

Навіна пра палон Ягайлы здавалася нейкім дурным сном.

- Так і трымае яго? Самога круля? – раздаваліся вакол галасы.

- У Вільні яго схапіў. Той як раз да яго па нейкіх справах літоўскіх прыехаў. І тут – весткі. Падольле ўсё узялі, аж да Луцку дайшлі. Ну і яшчэ нешта такое ганец з-пад Луцку распавёў, што Сьвідрыгайла проста азьвярэў ад злосьці. Крычэў нема, і каб Падольле Ліцьве вярталі – то бок, яму, і што ён Ягайлу за караля ня лічыць, і той яму наогул ніхто, здраднік літоўскае справе, а вось ён, Сьвідрыгайла, той душу за Ліцьву аддасі, і тое, і сёе, і што ўсе князі за яго, і наогул ні Ягайла, ні Карона ім не патрэбныя, і што яны зробяць як чэхі, сваю царкву, і сваіх папоў, і ўсё сваё, і яшчэ невядома што, і самі будуць свой лёс вырашаць, і ўсе землі ад Валыні да Падольля літоўскія, і для таго ён з малдаўскім гаспадаром дагаварыўся, і што тэўтоны яму дапамогуць.

- Карацей, як заўсёды, лухту нёс. Міхась паморшчыўся. – Дык а што Ягайла? Сядзіць?

- А куды яму дзявацца. Сядзіць, не падступішся. У Вільні.

- Хай пагаджаецца, скажа, што мы аддамо Сьвідрыгайле Падольле. Указ хай напіша. А мы па-свойму зробім. Міхась усьміхнуўся.

- Сьвечка у нас ёсьць? – запытаў ён пісара.

- Ёсьць, - здзіўлена вымавіў ён.

- Тягні аркуш і пяро. Пісаць будзем Ягайле ўказ. Усе вочы ўтаропіліся ў яго.

Міхась падміргнуў Тэадору.

- Хай Ягайла абяцае гэтаму дурню, што той хоча. Хоць луну зь неба ў ясны дзень.

- Міхал, - павярнуўся ён да малодшага Бучацкага. – Ведаю, ты мне не прабачыш, ды ты тут адзін, хто хоць неяк у сядле трымаецца. Астатнія вунь якія важкія, іх ня тое што вазок, калёсы не зьвязуць. Ты ж усё жадаў радзіме паслужыць.

Міхал пасунуўся бліжэй, нават шапку зьняў, каб лепей чуць.

- Зараз, пачакай. Міхась нешта напісаў на невялікім аркушы, разрэзаў сьвечку, уклаў туды ліст, нагрэў і заляпіў яе.

- На, трымай. Тут сапраўдны ўказ, брату твайму ў Камянцы. Каб Сьвідрыгале, сабаке паганаму, дзьверы не адчыняў, будзь на тое хоць воля Госпада Бога. Скачы да Міхала, і гэтую сьвечачку яму перадай. Хай ён яе пачытае, і запаліць ва славу Божую. А ты, Ян, скачы ў Вільню, падай у ногі, і кажы, што ты ад нас зьбёг, і што на Сьвідрыгайлаў бок перайсьці гатовы, і да таго ж ад усіх паноў кажаш, што яны крэпасьці сдамо, толькі каб загад круля на тое меўся. І калі гэты загад будзе, то па вызваленьні караля і яго ўласнаму слову мы ўсе крэпасьці палюбоўна назад вернем.

Бо мы міра хочам, і вінімся ў тым, што пасьпяшаліся, але вызваліць замкі толькі зь яго волі і па яго загаду можам, бо ж ня ведаем, што цяпер рабіць. І неяк паспрабуй да караля прабіцца і слова яму ціха шапнуць, што процілеглы яго загад праз мяне ужо на Камянец паехаў, а адтуль – і ва ўсе іньшыя крэпасьці будзе перададзены. З гэтымі словамі ён зьняў з рукі вялікую пячатку, і прылажыўся да нізу сьвечкі. Воск аплавіўся, і ўсе са здзіўленьнем убачылі каралеўскі знак, нябачны на зрэзе, так, што хто пра тое ня ведаў, той наўрад ці даведаўся б.

Глава 6: Дом

Нарэшце, ён пераступіў парог роднага дому. Больш за тры месяцы прайшло з тых пор, як яны рушылі на Падольле. Лісьце яшчэ не было залатым, а зараз ляжыць сьнег. Гурбы ўзьнімаліся ўжо высока, дзе намяло каню і пад бруха - зіма была раньняя. Але ж на дарогах і вуліцах ён ляжаў роўным, накатаным настам. Сонца радасна зьзяла, адбіваючыся ад бялюткага покрыва міргатлівымі іскрамі. Народ вакол ускрайкам вока пазіраў на яго - стомленага, зарослага барадой вершніка на худым кані з атрадам такой жа пашкамутанай вандроўкай чэлядзі і ваяроў у памятых панцырах - усё ж некалькі сутыкненьняў іх не абмінула.

Як яны сьпяшаліся дамоў! Нават у прыдарожных корчмах не спыняліся. Войска разышлося, раз’ехаліся паны, і яго невялічкі атрадзік крочыў па занесенных сьнегам дарогах. Галоўная частка яго людзей раз’ехалася па сваіх мястэчках, частка з тэўтонаў накіравалася ў казармы ў горадзе, і толькі самыя блізкія і верныя засталіся побач: атрад сербаў-гусараў, ахова яшчэ зь Вітаўтавых часоў, на чале з Ваіславам, верныя ліцьвіны – старыя сябры, якіх ён узяў з сабой з радзімы, некалькі рыцараў, знаёмых яшчэ з Грунвальду. Час ураўняў усіх, і ворагаў, і сяброў, і цяпер яны крочылі разам, прыгнутыя адным цяжарам – доўгай дарогай, якая, чым бліжэй да роднага парогу, тым больш здавалася непераноснай. Хоць і родным гэты парог у пэўным сэньсе назваць было нельга, бо ж радзіма ва ўсіх іх была далёка, у некаторых і значна далей за Падольле з Валыньню. А хтосьці яе наогул згубіў, паглынутую хвалямі асманаў, няспынна каціўшыміся на Захад, каб разьбіцца аб чарговы жывы хвалялом, і ізноў адхлынуць, але ж толькі каб сабраць моц для ўдару.

Непакойны, бурлівы час, як жоран, перамолваючы жывую плоць, знішчаючы ў пыл і попел цела, каб вызваліць зь яго душу. Калі-некалі яму здавалася, што нябёсы ад яго так блізка, што ён можа працягнуць руку, і крануць іх, як рыбіну праз празрыстую таўшчыню вады. Але ж і рыба тая аказвалася

ценьню, і нябёсы – сном. Цікава, ці дасягалі іх тыя сьвятары, што служаць у царквах і касьцёлах? Хоць хтосьці зь іх калісьці бачыў нябёсы? Напэўна, не. Напэўна, нябёсы – гэта мара, якой толькі і жыве чалавек. Бо калі б іх не было, чаму б яму жыць наогул?

Ён паправіў футравую шапку рукой у цяжкой рукавіцы, скураной, зь металёвымі накладкамі, апушанай футрам, нацягнуў лейцы, і конь заіржэў, закруціў галавой.

Дом вырас за паваротам дарогі – вялікі трохпавярховы будынак, які ён прыдбаў сабе пару год таму. Спачатку ён лічыў яго багатым, але ўсё ж часовым прытулкам, ды так апынулася, што цяпер прытулак і сапраўды стаў яго домам. А цяпер вяртацца ў Ліцьву і наогул нельга, бо не вядома, дзе, як і калі ўдарыць молат вайны. А што ён ударыць, ён не сумняваўся. Раструшчыць, расплюшчыць, разьнясе ў шчапу не адно жыцьцё. Таму лепей трымацца тут, бліжэй да моцы, улады. Можа, адзін бы ён і працягваў жыць, як воўк, у сваіх глухіх лясах, аднак ён павінен клапаціцца аб сям'і. І дзіцям патрэбна сьвецкае выхаваньне, адукацыя. А кім яны вырастуць у тым закінутым замку ды лясным маёнтку? Цяпер гэта былі яго паляўнічыя ўгодзьдзі, якія ён спачатку наведваў некалькі разоў у год, а потым – і меней. Не да таго было, ня меў ён часу. Там цякло сваё, уласнае, уладкаванае ім жыцьцё. У саборы ішлі набажэнствы, школа і лякарня працавалі, сяляне спраўна засявалі палі, усё – пад кіраўніцтвам аканома, сям'я якога пасялілася ў прыстройцы да маёнтку. У замку стаяў гарнізон, вартаваў мяжу, пазіраў на ўсход, у бок Полацку, і на поўнач – у жамойцкія лясы. Але ж пакуль вакол было ціха. Сьвідрыгайла пасьля Вітаўтавай сьмерці засеў ў Вільні і Троках, дзе зараз знаходзіўся і Ягайла. Праз пару дзён Ян дабярэцца да яго, і, дапамажы яму Бог, здолее ашукаць ашуканца. Ён усьміхнуўся. А тым часам Міхал запаліць сьвечку з царскай пячаткай, зь якой разам ператорыцца ў дым і попел і яго – Ягайлава – пісьмо. Трэба выбіраць бакі – такі ўжо цяпер час. Адной нагой там, другой – тут стаяць не атрымаецца. Хутка гэтыя ільдзіны разыйдуцца, і той, хто ня вырашыў, куды скочыць, трапіць у сьмяротную лядзяную палыньню. Нясе іх халодная вада – адну на Захад, другую – на Ўсход, і ўсё далей і далей яны адна ад

другой. Халодная, стылая вада нянавісьці, чорная, як вір, разьліваецца паміж імі. Не пераскочыш яе, толькі захлінуцца можна – з галавой, пайсьці на дно ў цяжкіх дасьпехах, туды, дзе горла перахопіць жалезны абруч, калі брат ператворыцца ў забойцу брата. Ні Каін, ні Абель не абіралі самі свой шлях. Так за іх вырашыў Бог. Аднаму зь іх прыйдзецца ўзьняць руку, а другому – загінуць ад яе. Усе лёсы напісаны на нябёсах. Лёс яго – змагацца, і іньшага яму не дано. Ён ужо не саступіць з гэтага шляху, як бы сам таго не жадаў. Дужа шмат людзей ад яго залежыць, залежыць і лёс краіны. Неяк ён апынуўся на самай вяршыні, у гушчары падзей. Сам таго не чакаў, ды вось – давялося. Думкі яго перарваліся. Гэта ўсё потым! Конь стрыг вушамі, чуяў – набліжаецца дом. Ён ударыў яго лёгка нагамі ў бакі, і жывёліна пабегла шпарчэй.

Дом стаяў, занесены сьнегам, зь бялюткім дахам, з трубы на якім ішоў густы белы дым. На двары мужык калоў дровы, гакаў, выціраў пот з чырвонага ілбу. Нейкая кабета несла ад калодзежа вёдры. Чалавек у чорнай расе - настаўнік, сышоў з ганку, пахлопаў сябе па баках, ахапіў рукамі – халодна! – і хуткім крокам накіраваўся да брамкі. Ледзь пасьпеў, небарака, праскочыць, каб не замінаць дарогі вершнікам. Усім кагалам яны ўехалі на двор, і да іх адразу кінулася напалоханая, расхрістаная чэлядзь.

- Пан прыехаў! Пан! – чулася вакол.

Яна пачула крыкі, і кінулася да вакна. На двары атрад сьпешваўся, аддаваў коней. Нехта прагна піў халодную калодзежную ваду зь вядра, якое прытрымлівала плячыстая дзеўка з крутымі сьцёгнамі. На двары стаялі шум, мітусьня. Гусары трымаліся роўна, строем, чакалі загаду. І раптам яе сэрца абвалілася - высокі, цёмны, зарослы барадой вершнік саскочыў з каня, і шырокім крокам накіраваўся да дзьвярэй. Узышоў на ганак. Ледзь накінуўшы кароткае футра, яна кінулася ўніз па ступеньках, і выбегла вонкі, на мароз, роўна каб упасьці у яго рукі, калі ён зьбіраўся адчыніць дзьверы. Сонца раптам асьляпіла яе. Недзе гучна біла капель, прама як вясной. Неба было ярка-блакітным, і яго твар насупраць сонца здаваўся яшчэ цямнейным, абветраным, зарослым барадой па

самыя вочы. Толькі зубы бялелі. Моцныя рукі ахапілі яе, прыціснулі. Яна адчула цьвёрдыя пласьціны мяталу на яго грудзях пад сукняй, моцны дарожны пах – вогнішчамі, канём, дарогай. І – ім. Яго родны, любы ёй пах, які яна ня зь кім не пераблытае. Яго твар нахінуўся над ёй, і ён пацалаваў яе, крэпка, так, як мог рабіць толькі ён. Яго вусны цесна прыціснуліся да яе вуснаў, рассоўваючы іх, вусы і барада калоліся, валасы краналі шчаку. Яго шчокі ўваліліся, вочы глядзелі глыбока з-пад чорных броваў, але ж ён усьміхаўся. Адсунуў яе крыху, і глядзеў ёй у твар, ня кажучы нічога. Нарэшце вымавіў:

- Красуня мая! Не чакала? А я – вось ён. Жывы, здаровы. І ізноў прыціснуў яе да грудзей. І тады яна, ня стрымліваючыся болей, заплакала.

- Чаго ты плачаш, золатка? Я ж тут, усё добра. Ён кранаў вуснамі яе валасы, рукі ў рукавіцах гладзілі яе сьпіну, футра зь якой упала, і апынулася на падлозе.

- Ад радасьці, - прашаптала яна. – Таму што ты дома. Што ты тут, і жывы. Сьлёзы душылі яе, і ён абдымаў яе, і не казаў нічога. І раптам яна зразумела, нават і не зазіраючы яму ў твар, што ён тожа ціха плача.

Глава 7: Начны госьць

Ён ступіў на родны парог, і цяжар адразу зьнік зь яго плечаў, быццам бы яго і не было. Ды адначасова навалілася стома. Месяцы вандровак выматалі яго, начлег пад аткрытым небам, пад ветрам і даждом, дні пераходаў, хоць абышлося і бяз боек, і на сваім шляху ад адной крэпасьці да другой яны не сустракалі ніякіх перашкодаў. Крэпасьці адкрывалі ім дзьверы не сказаць, каб ахвотна, але ж і не супраціўляючыся. Усе разумелі, што набліжаецца вялікая вайна, і кожны бок затойваўся, і зьбіраў сілы, не жадаючы траціць іх у марных сутыкненьнях. Усе вакол чакалі. Чакалі невядома чаго. Князі зьбіраліся ў хаўрусы, радзіліся і дамаўляліся ў нанова адбудаваных замках, і старых, імшэлых, і ў дамах і ў маёнтках, і ў палацах – усюды кіпела жыцьце, ішло абмеркаваньне. Але ж – між сваімі. Хаўрусы не дапускалі ў сябе чужакоў. І такіх абасобленых колаў станавілася больш, і больш. Краіна развальвалася на кавалкі, разумеў ён. Справа Вітаўта гінула, і гэта адгукалася болем у яго сэрцы. Якое яно не трывалае, жыцьцё, і яго справы. Толькі здаецца, што адбудавана нешта, што прастаіць вякі, да ўдарае навала, і ўсё разьлятаецца ў прах. Будуй ізноў, аднаўляй, умацоўвай. Як і добры дом, краіна патрабуе трывалага падмурку. І калі ён заложаны, то колькі б не зьнішчалі сьцены, будынак на падмурку будзе паўставаць зноў і зноў, хай ляцяць гады, вякі, ён не пахісьнецца. І жыць у ім будзе і ладна, і годна. І вольна.

- За што я змагаюся? – запытваў ён сам сябе. І сам сабе адказваў:

- За волю. За годнасьць чалавечую. За розум. За права абіраць свой шлях. За тое, каб ня мець над сабой ні чужынца, ні звар’яцелага ката, каб мець права сказаць сваё слова, так, як ён лічыць патрэбным, і хадзіць па сваёй зямлі, не баючыся, а сапраўдным гаспадаром. Каб не хіліцца халопам, не прыкідвацца дурнем перад дурнямі. Каб мець сваю ўласную веру, і маліцца Богу так, як просіць яго сэрца. Каб жыць па волі Божай, а не самавольству чалавечаму, і шукаць гэтую волю

глыбока ў сваім сэрцы, жыць па праўдзе, зь любоўю, у міры і згодзе. Толькі гэтага ён хацеў. Здаецца, ня шмат, але ж гэта ў яго хацелі адняць.

Ці грошаў ён жадаў? Не, бо яны ў яго былі. Зарабіць грошы – гэта было для яго ня цяжка. Даходаў ад зямлі і службы яму хапала. Не пашырыць свае ўладаньні ён жадаў, таму што зь імі пашырыліся б і клопаты. Ён жадаў выратаваць Вітаўтаву справу, працягнуць яе, і пашырыць, умацаваць. Сьвідрыгайла ж намагаўся зрабіць процілеглае. Смута, якую ён ствараў, ірвала краіну на часткі, і ён не разумеў гэтага. Вочы ў яго былі, але ж нічога ня бачылі, засланыя крыўдай і жарсьцямі, якія спапялялі і яго, і ўсё вакол.

У такі дом ён вярнуўся – не такі, як пакінуў. Цішыня і мір вакол здаваліся кволымі, няпэўнымі, зманлівымі прывідамі.

Сьпякотнае жнівеньскае сонца размарыла ўсіх, у паветры ўжо дзе-нідзе лятала павуціньне, зелёныя галіны хіліліся, і ў іх громка пелі птушкі. Краявід нагадваў ціхі вырай, зь бягучай за сьпіной ракой, якая ціха журчэла па каменьчыках, нібыта сьпявала лагодную песеньку. Кірасы і шлемы даўно ўжо былі зьняты ды адложаны ў бок, зброя таксама ляжала ў футаралах. Усе адчувалі пераможны канец непрыемнай кампаніі. Канешне ж, Сьвідрыгайла адумаўся, і ўсё гэта зараз мінуе, як дурнаваты сон, і яны адправяцца па дамах, да сем’яў, якія ня бачылі з тых пор, як растаў сьнег, і падсохлі дарогі.

Птушка голасна пела над самай галавой. Ян пацягнуўся, прыкрыў вочы. Яго марыў сон. І раптам ён адчуў моцны штуршок у бок.

- Уставай!

Ён ускочыў, нібыта ашалелы, апраўляючы рэмень, на якім вісеў меч.

Ад сьцяны раздаваліся жудасныя крыкі.

Міхась, які разбудзіў яго штуркам, ня спаў, стаяў, разглядаючы сьцяну. Ня тое, каб ён пільнаваў яе, больш думаў, якімі прыладамі і як яе пераадолець. Лесьвіц з сабой не хапала, вышкі не зрабілі, бо ж сапраўднае аблогі, шчыра кажучы, не чакалі. Думалі, Юрша адчыніць ім дзьверы адразу пасьля таго, як яны адкінуць Сьвідрыгайлава войска.

І раптам яго вочы ўбачылі здалёк, як, нібыта чорны віхур, з варот на раськінуўшыйся ляніва лагер ляціць вялікі атрад. Напэўна, увесь гарнізон фартэцыі скакаў на іх у палу адчайнае атакі, відавочна маючы намер зьнішчыць лагер.

Вылаяўшыся страшэнна, ён кінуўся наперад – да варот, туды, дзе ужо пачало атрымоўвацца дзікае месіва з безаружных напаўадзетых целаў і рубячых іх шалёна вершнікаў, зьбіраючы вакол сябе ваяроў, хрыплым, сарваным голам аддаючы каманды. Здаецца, пра Яна забылі, аднак ён, наадварот, узрадваўся.

Зараз ён пакажа сябе, чаго ён варты! Прыйшоў час праславіцца ў бойцы – тое, што ён так доўга чакаў. Ён ускочыў на каня, і паляцеў, пераскокваючы праз перакуленыя сталы і вазкі, не разьбіраючы дарогі. Што было далей, ён ня памятаваў. Быццам бы нейкая чырвоная пялёнка заслала яму вочы. Яму хацелася толькі аднаго – забіваць. Як віхур, ён уляцеў у натоўп, выхапіўшы меч. Усё апынулася лёгка, і проста. Адзін зь нямногіх, гатовых да бойкі, апрануты у цяжкія дасьпехі, якія бацька забараніў яму зьнімаць, закрыўшы твар забралам, ён быў недасяжны для мячоў і дзідаў, ад якіх кучна падалі ваяры вакол. Яго конь, цяжкі, сьвірэпы, грудзямі сустракаў ў грудзі каней супраціўнікаў, адкідваў іх далёка, хватаў зубамі і сьцягваў верўнікаў, біў капытом. Меч у яго руцэ бліскаў, нібыта маланка – не дарма ж столькі рыхтаваўся. Страху ў ім не было – што такое страх, ён ня ведаў. Ськінуўшы з каня дзідай аднаго ваяра, разрубіў другога. На дзіва, ня ўсе зь іх мелі нават і цяжкія дасьпехі. Многія русіны былі ў скураных жакетах, панцырных кашулях. Ён проста рабіў тое, што рабіў на турнірах – дзіда, меч, яшчэ адна дзіда, і ізноў – цяжкі палаш, а другой рукой – лёгкі, кароткі, якім ён прабіў галаву нейкаму ваяру,

намагаючымуся сьцягнуць яго з каня.

Хутка на месца бойкі хто бягом, хто на кані, кінуліся ўзброеныя рыцары. Атрад, адчайна выскачыўшы з варотаў, пачаў прабіваць дарогу да адступленьня, бо ж войска значна пераважала іх лікам.

І тады ён кінуўся ўсьлед за адыходзячымі, працягваючы рубіць, ужо ня гледзячы, каго і як.

Высокі, мажны чалавек у дасьпеху на кані апынуўся насупраць яго, вочы ў вочы. Яна абдала густым пахам поту і крыві, якая цякла у ваяра з-пад панцыра, аднак ён крэпка трымаўся ў сядле, і бегчы прэч не зьбіраўся. Наадварот, нібыта гуляючы мячом, перакідваючы яго з рукі ў руку, выбіраў месца для атакі. Ян выставіў дзіду, і кінуўся на яго. Той, не адварочваючы прэч каня, паскакаў яму насустрач. Гэта быў бывалы і моцны рыцар, і вочы яго былі жорсткімі, калючымі, халоднымі, як зімовая вада, з-пад нізкіх рудаватых броваў. Рудая барада тырчэла наперад, плечы і рукі былі вялікімі, як у мядзьведзя. І ён прама ляцеў на Янава каня, на настаўленую на яго дзіду, якую Ян крэпка трымаў у кальцы ля боку. Здавалася, праз імгненьне вершнік натыкнецца на вастрыё, і Яну здалося, што, можа, гэты чалавек такім чынам сам сабе шукае сьмерці, аднак адбылося нешта нечаканае. Перад самым сутыкненьнем конь рудога хутка адскочыў у бок, манёўрам, раней Янам ня бачаным, і ён праляцеў далёка наперад, разумеючы, што зараз чалавек ударыць яго ззаду. Нейкім дзівосным чынам здолеўшы разьвярнуць каня, Ян ледзь пасьпеў сустрэць вершніка мячом аб меч. Жалеза гучна ляснула, і Яна жахнула моц, якая абрушылася на яго руку. Яму здалося, што яго кісць і плячо раструшчаны, аднак, ён пасьпеў перахапіць меч, ды ваяр не сьпяшаўся пусьціць у ход свой, драпежна ўсьміхаючыся, ашчэрыўшы зубы, зь якіх, як у шалёнага сабакі, цякла пена, зьмешаная з крывёю. Ян узьняў на дыбкі каня, гатуючыся кінуць буйную жывёлу на супраціўніка, каб зьбіць яго, зьмяшаць з растаптанай гразьзю, і тут пабачыў, як нехта скоча да яго ад лагера. Бойка сьціхла, і ваяры застылі, гледзячы на іх спаборніцтва, і толькі высокі вершнік у чорных дасьпехах на вараном кані ляцеў у іх бок.

- Юрша! Юрша! – пачуў Ян знаёмы голас. – Пёс-здраднік! Ваюеш з дзецьмі? Паспрабуй пабіцца са мной! Бунтаўшчык, Каінава семя!

Ваяр развярнуўся на голас, і раптам зарагатаў.

- Пан Міхал уласнай персонай! Раптам ён шырока разьвёў рукі, быццам бы дэманструючы, што наогул і не зьбіраўся біцца, а так, выехаў праветрыцца ды пагуляць у полі.

Міхась спыніўся перад ім, выставіўшы наперад меч, адсоўваючы ў бок каня Яна, закрываючы яго сабой.

- Досыць крыві, досыць сьмярцей, - вымавіў ён хрыпла, голасам нізкім, страшным, такім, што ў Яна валасы пад шлемам узьняліся.

- Ты даволі ўжо прынёс шкоды, глядзі – вунь яны, вераломна забітыя табой славутыя рыцары, якія маглі б абараняць радзіму, але ж цяпер стануць ежай чарвям. Сьлёзы іх жанок і сірат-дзяцей - гэта твая ўзнагарода. Трымай яе, толькі здолей зьнесьці. Нясі яе з сабой да самога пекла! Каб вас разарвала, будзьце вы праклятыя на сто кален наперад! Дурні і здраднікі. Міхась сплюнуў. Юрша ў адказ харкнуў – крывёю.

- Твой шчанюк здорава шарпануў мяне дзідай, - раптам зарагатаў ён. – Не хвалюйся, яго я сіратой не пакіну. І не крану. З гэтымі яго словамі Ян нацягнуў лейцы, але ж страшным ударам у бок Міхась спыніў каня, і стаў поперак паміж ім і намесьнікам крэпасьці.

- Я сказаў, досыць! Спыніся! Калі ты ня ведаеш нічога, то ведаю я. Сёньня мы чакаем перамоваў.

Сьвідрыгайла прыняў нашую прапанову аб сустрэчы дванаццаць на дванаццаць. І, раптам у адказ на яго словы, здалёк пачуўся конскі тупат. Группа вершнікаў зь белым сьцягам скакала па дарозе збоч замку.

Юрша павярнуў галаву ў бок коньнікаў, а потым зарагатаў, і махнуў рукой.

- Трус і пёс! Ён кашлянуў, і яшчэ раз сплюнуў крывёю.

- Сьвідрыгайла нам здрадзіў – здрадзіць і вам, памятайце. З гэтымі словамі ён паскакаў да пралому ў сьцяне, і хутка скрыўся ў замку.

Ян сядзеў, хістаючыся, на кані. Чырвоны туман ізноў засьцілаў яго вочы, і на гэты раз ён быў густы, душны, цяжкі, быццам бы яго хтосьці душыў вялікім тоўстым шалем.

З апошніх сілаў ён схапіўся рукамі за луку сядла, і ўпаў наперад, прыціскаючыся да шыі каня грудзямі.

- Бацька, бацька! – пачуў ён, быццам здалёк, свой голас – нечакана слабы, і нейкі дзіцячы, як у хлапчука-падлетка, якім ён, насамрэч, і быў. Вялікае цела варанога каня збоч ад яго не дало яму зваліцца на зямлю, і яго падхапіла моцная, цяжкая рука. З цяжарам ён намацаў лейцы, і марудна выпраміўся ў сядле, сьцягнуў шлем. Туман паступова адыходзіў, але ж тут пранізала дзікая боль у руцэ, ад якой ён ледзь не закрычэў.

- Ну што ты, што ты, цішэй, - пачуў ён родны голас побач. – Такая яна, вайна, сынок. Страшная. І канчаецца сьмерцю. Ды ўсё абышлося. Нічога ж ня здарылася, падумаеш, рука. Яна ж на месцы. Так, ці не? Ты правер, не адвалілася? Здаецца, бацька жартаваў, казаў нешта, каб яго сьвядомасьць ізноў не пачала ўскользваць. – А ты колькі рук адсек? Мо з дзесятак. Панявечыў мне ліцьвінаў, сапсаваў дурняў. Куды іх цяпер? Нават і ў хлопы ня годныя. Ён слаба ўсьміхнуўся. Бацька яшчэ казаў нешта, ён ківаў, намагаючыся не зваліцца з каня. Нарэшце, перад імі вырасьлі абрысы лагеру, да якога, здаецца, было не некалькі сотняў метраў, а некалькі вёрст.

Міхась ледзь саскочыў з каня, толькі каб пасьпець паймаць яго, калі ўсё ж яго галава стала лёгкай-лёгкай, быццам пярынка, якая чамусьці ўзьнімалася ўгару.

Глава 17: Дамоў

Ян прыйшоў у сябе на калёсах, якія мерна пакачваліся па дарозе. Побач зь ім ляжала яшчэ некалькі ваяроў, парубленых у мінулай бойцы.

Ён паспрабаваў узьняцца, і ўскрыкнуў ад болю ў руцэ.

- Тыдзень ты ў жару ляжаў, ваяр, - вымавіў адзін зь іх, бледны, з закручанымі рудымі вусамі, малады рыцар, трымаючыйся за перавязаны жывот.

- Ужо і Сьвідрыгайла тут быў, і перамір’е заключана. Дамоў едзем. Аднак Валынь за ім засталася, і Падольля два гарады – Вінніца ды Брацлаў.

Астатняе – наша. Усё ж, не дарма мы кроў пралівалі. Ну а далей – хай паны глядзяць, як ім быць. А я дамоў хачу. У мяне жонка маладая. Гарачая – кроў з малаком. А ў цябе? У цябе жонка ёсьць?

- У мяне – нявеста. Ян паморшчыўся, асьцярожна паправіўшы руку, якая ляжала на перавязі.

- Прыгожая? А колькі год? Рыцар апынуўся любіцелем паразмаўляць.

- Трынаццаць. Ян адкінуўся на ахапку сена – сьпіна таксама балела.

- Ого! Зусім маладая. А табе колькі?

- Мне – шаснаццаць. Яну ўжо пачаў надакучваць гэты допыт.

- Да ты што! – рыцар зьдзівіўся. – А мы думалі, што за ваяр такі. Ты ж самога Юршу ледзь не забіў. Ён дагэтуль крывёю харкае. Усё ж задзеў ты яму бок дзідай. Мы такога і ня бачылі – каб у бойцы як на турніры рыцар скакаў. Мы ўсё больш па-простаму. Сякіра ды булава. Кісьцень. Гэта вы – паны, з манерамі. Ён

шырока ўсьміхнуўся.

- А мне – дваццаць шесць год. Якуб мяне завуць. Якуб з Сендаміру.

- А я там быў. Ян таксама усьмінуўся.

- А дзе ты там быў? Чаго я цябе ня бачыў? – Якуб зьдзіўіўся, быццам бы ўсе, хто бываў у горадзе, наперад завітвалі да яго.

- Быў на сойме, там, дзе пра вайну вырашалі.

- О, так ты – высокі пан! На сойме, гэта з крулем?

- Так. Ян узяў саломінку, пакруціў, заціснуў вуснамі. Неба, галубое, плыло ў іх над галовамі.

- Я Чорнага сын. Міхала Чорнага, не Завішы, - патлумачыў ён.

- А я – ксяндза сын. Якуб раптам зарагатаў. – Бацька мой потым адрокся, ізноў з манахаў у рыцары пайшоў. Ды недзе ў туркаў і зьгінуў. А маці мая, Катаржына Пшэбінска, са старога роду. Тут ён назваў доўгую складаную фамілію, якая Яну казала няшмат. – З Мазовіі. А яе продкі – з Прусіі. Таму я і такі руды. Эх, выпілі б мы за сустрэчу, за знаёмства, пан Ян. Ды нажаль, няма чаго.

- Потым вып’ем. У нас яшчэ будзе шмат часу. Ян усьміхнуўся. Цяпер яму здавалася, што жыцьцё, як і гэтае неба, бясконцае. І такое ж чыстае, і сьветлае. Доўгае, як гэта дарога, што ляжала ў іх наперадзе.

Ягайлава стаўка ў вялікім чырвоным шатры пасярод лагеру кіпела навінамі. Ужо на падыходзе да дому даведаліся, што малдаўскае войска, якое па закліку Сьвідрыгайлы кінулася рабаваць падольскае памежжа, такім чынам дэманструючы яму лаяльнасць як хаўрусніку, было ўшчэнт разьбітае братамі Бучацкімі. Два Міхалы і Тэадор па асобку вынішчылі раськіданыя невялікія атрады, якія не чакалі супраціву, а сам малдаўскі гаспадар ад гора захварэў і сьлёг – можа, што доўга і не пражыве.

- Мае спачуваньні ягамосьці малдаўскаму крулю. Ягайла

падцісную вусны. – Такі сорам на яго сівую бараду. Кажуць, ён бег так хутка, што пакідаў усе вазы з нарабаваным па наваколлі.

- Ай-я-яй. Ня гожа хрысьціянскаму гаспадару як тацю перасякаць суседскую мяжу, каб накрасьці поўныя карманы чужых яблык. І што, у яго свае сады не ўрадзілі?

Прыгожы, вытанчаны рыцар нахіліў галаву з доўгімі сьветлымі кудзерамі, усьміхаючыся ў карункавую насоўку.

Ягайла паморшчыўся, непрыязна гледзячы на яго.

- Пан Зарэмба, вось гляжу я на цябе, і бачу француза, а не як не паляка. Як хутка вы, моладзь, набіраецеся чужынскіх манэраў ды хітрыкаў. Ня гожа казаць так пра караля, хоць бы то і іншае краіны, і …

- Адмеціўшагася непрыстойнымі дзеяньнямі, - ветліва падказаў Якуб Кабылянскі – узор рыцарскай годнасьці і шляхетнасьці, выступіўшы ў абарону Ваўржынца, які насоўку хутка схаваў, і стаў прама, адкінуўшы шаўковыя кудзеры, аддана гледзячы ў Ягайлаў твар.

- Ай, ну вас! Ягайла раптам зарагатаў. Пачуўшы палёгку, вакол засьмяяліся і ўсе астатнія.

- Навошта табе гэтая анучка, ды яшчэ з карункамі. У цябе што, рукавоў няма?

Ягайла ізноў рассьмяяўся.

- Ёсьць, але ж … вузкаваты. Не хапае. Ваўржынец разьвёў рукамі. - Каб маскоўскі кафтан, дык мне б на ўсё хапіла … рукавоў, - дадаў ён.

Рогат вакол не сьціхаў, настрой ва ўсіх быў добры, і кожны жарт падаў у натоўп, як іскра ў сухі порах.

- А яшчэ, ведаеце, мосьцьпанства, у Кракаве нядаўна быў феерверк.

- Было што? Ягайла ізноў падазрона глянуў на маршалка.

- Сьвята, ваша каралеўская мосьць. Хлопы разьбілі тэўтонаў. Заремба нахіліў галаву яшчэ ніжэй.

- Як хлопы - тэўтонаў?

Ягайла вытарапіў на яго вочы.

- Дужа проста, ваша каралеўская мосьць. Сёньня раніцой мы атрымалі зьвесткі. Ян Ярагнеўскі зь Ярагневіц, гербу Орля, Дабрагост з Кольна і Прусіма, ды Барташ III Веземборг, абодзьва - герба Наленч. Гэтыя шаноўныя рыцары сабралі войска з хлопаў, і тыя, узброеныя сякерамі і косамі, раськідалі перадавыя атрады тэўтонскага і лівонскага войскаў, якія рабавалі Дабжынскую зямлю, Куяны і Крайну. Гагенкірхем з Тухолі загінуў, але ж маршал Несельродэ, і іньшыя здолелі зьбегчы. Кажуць, што сяляне распранулі цела Гагенкірхейма нагола, і ён так і ляжаў у брудзе ў касьцюме Адама, пакуль яго не спазнаў нехта з рыцараў.

- Якое гора! – Ягайла прытворна ўзьняў вочы. – Якая зьнявага беднаму рыцару крыжа. Як жа тое магло адбыцца?

Ён строга глянуў на Вавржынца, але ж яго вочы цяпер таксама сьмяяліся.

- Такое можа адбыцца, ваша каралеўская мосьць, калі вы прабіраецеся ў дом, як вор, у адсутнасьці гаспадара, спадзяючыся сустрэць там толькі хлопаў; але ж нечакана гэтых хлопаў узначальваюць некалькі годных рыцараў, ваша каралеўская мосьць. Вавржынец нізка пахіліўся ізноў.

- Усё гэта – добрыя весткі! Таму я загадваю адкрыць бачонак з мальвазіяй, і ні аб чым болей не думаць. Хутка мы апынемся дома, шаноўнае панства!

Ягайла махнуў крысом доўгай чорнай сукні, падбітай мехам, паварочваючыся да прысутных, і яму адказаў гучны гул радаснага натоўпу.

Якуб з Міхасём выйшлі з шатру, і прайшліся ўздоўж яго боку туды, дзе было больш зацішна, і ня сустракаліся ні шляхціцы, ні кнехты.

- Мяркуеш, цяпер можна і выпіць, пан Чорны? – Якуб, усьміхаючыся, глядзеў на Міхася, быццам бы ў люстэрка. Такі ж высокі, моцны, шырокі ў плячах, але ж больш цяжкі, зь сівымі доўгімі валасамі, выгаленай барадой і доўгімі чорнымі вусамі, гэта быў магутны рыцар, прыгожы і годны, велічны, маючы тое прыроджанае шляхецства, што адрозьнівае высокія душы, створаныя такімі самім Панам Богам. Яго разумныя вузкія вочы, амаль чорныя, глядзелі на Міхася запытальна.

- Мяркую, што цяпер можна, пан Кабылянскі. Міхась таксама ўсьміхнуўся. – Але ж я б не расслабляўся. Страціўшы падтрымку малдаванаў і тэўтонаў, ды яшчэ такім ганебным чынам, Сьвідрыгайла звар'яцее ад злосьці. А калі ён вар'яцее, што адбываецца пастаянна, ды яшчэ пры гэтым напіваецца, што супадае з тым, калі ён вар'яцее, то ён здольны на неверагодна дурныя ўчынкі.

Якуб кіўнуў.

- Тады мы зь ім яшчэ сустрэнемся, я мяркую.

- Сустрэнемся. Абавязкова. Але ж пакуль ён будзе залізваць раны, мы ня будзем спаць у шапку.

- Жыгімонт?

Міхась кіўнуў.

- Так.

Якуб нічога не адказаў.

- Ты ведаеш, - памаўчаўшы, вымавіў ён. – Я ўсё ж больш ваяр, чым палітык. У рыцарскай справе ўсё дужа проста. На кожны выпадак напісаны кодэксы, якія дзейнічаюць незалежна ад краіны і падданства. Ня істотна, хто твой круль, ці адкуль ты – рыцар павінен строга выконваць тое, што напісана ў кодэксах, на якіх ён пакляўся. Я ня ведаю штукарстваў, і ня ўмею

інтрыгаваць. Можа, тое і дарма, і такім, як я, у гэтым сьвеце ня выжыць. Мала нам часу засталося, рыцарам. Наперад выходзяць такія, спрытныя, лоўкія, як Вавржынец. Ён і прыгожы, і вумны, і шляхетны. І пралезе ўсюды, як ліс. Я ж, наадварот, адчуваю сябе зубром. Надта вялікай для гэтага лесу істотай, якая пакуль што выклікае павагу, ды час яе вырашаны. Ты ж, Міхал, не такі, як я. У цябе больш гібкасьці і разуменьня ўсіх гэтых тонкасьцей. Аднак будзь асьцярожны. Усё ж ты – майго племені, не лісінага.

- Я – воўк, Якуб. Праўда, ужо стары.

- А мне здаецца, ты – тур. Які падыме на свае рогі любога ваўка. Ваўком жа больш бачу Сьвідрыгайлу. Якуб усьміхнуўся.

- Ня варты ён мянушкі ваўка. Міхась пакачаў галавой. - Так, пёс, які мніць сябе ваўком. Тое больш да яго пасуе. Нацярпецца такога сраму. Усе яго хаўрусьнікі заплямілі сябе ганьбой. Цяпер жа яму засталіся толькі рускія князі, ды тыя літоўцы, каму нянавісьць да Кароны асьляпіла вочы.

- Ты пойдзеш са мной, Якуб? Разам? Як тады, пры Грунвальдзе?

Міхась запытальна глядзеў на старога рыцара.

- Пайду, Міхал. У імя вялікага князя Вітаўта і яго памяці. Якуб ахапіў Міхася за плечы цяжкой рукой, і імгненьне яны стаялі, як два закаваныя ў сталь калосы.

- Больш ня будзе такіх людзей, як ён, - падумалася Якубу. – Цяпер такіх ня родзяць. Новыя людзі – мяльчэйшыя, і ў думках, і ў пачуцьцях. Час рыцараў і сапраўды сыходзіць. Напэўна, хутка і мы спатрэбімся Пану-Богу ў яго нябёсным воінстве. Але ж пакуль мы тут, мы будзем рабіць сваю справу.

Глава 18: Жонка

Яна малілася, стоячы на каленях. Пышны падол аксамітнай чорнай сукенкі накрыў падлогу, працягнуўшыся за ёй доўгім ценем. Яе галаву закрываў тонкі жалобны вэлюм, прышпілены да разнога грэбню, прыкрываючы яе твар. Яна застыла, і толькі вусны варушыліся, словы падалі ўніз, шапочучы, як лёгкія пацеркі з разарванай ніткі.

- Дзе ты, каханы мой? – ціха вымавіла яна. – Чаму ты мяне пакінуў? Сьвет ня мілы безь цябе, і ноч гэта цёмная, і халодная, як сьмерць. Сьвяча на стале мірганула, дагараючы. Яна не паўстала, і не паклікала слугаў. Толькі вагеньчык алеевай лямпы ля трыпціху на алтары асьвятляў пакой.

Што заставалася ёй делаць у гэтым змроку і холадзе багатага дома, у якім яна была адна, як прывід, сярод чужых твараў? Сёньня да яе завітала жонка Завішы, Барбара, ды настрою ёй не ўзьняла. З самае страшной сьмерці мужа ад турэцкае шаблі на сербскай зямлі яна насіла траўр, які ўжо ніколі ня здыме. Залатыя кудзеры Барбары пакуль не крануў сьнег. Твар яе быў прыгожы ўзьнёслай, вытанчанай, спакойнай прыгажосьцю. Яе моцнае цела нарадзіла чатырох дзяцей, усе – хлопцы, і ўсе жывыя. Пакуль жывыя. Барбара ўяўляла ўзор хрысьціянскае дабрачыннасьці і пакоры. Яна шчыра суцяшала Летыцыю добрым словам і цытатамі з Пісаньня, намагаючыся адцягнуць яе ад сумных думак.

- Гэта вайна – і не вайна зусім, - суцяшала яна яе. – Проста паход, куды адправіўся сам круль. Можна лічыць, што гэта ўсяго толькі агляд уладаньняў. Усё ж, яны на хрысьціянскай зямлі. Тут яе голас сарваўся, і яна закрыла твар рукамі. Цяпер ужо Летыцыя суцяшала яе. Барбара плакала ў голас. Цела Завішы так і не было знойдзена, і яго магіла ў францысканскім касьцёле Кракава была пустой. Казалі, што яму адсеклі галаву. Думкі аб гэтым разьдзіралі сэрца Барбары, як бязьлітасныя жалезныя кіпцюры. У начы яна сьніла гэты бясконца

паўтараючыйся сон: ён стаіць, зьвязаны, сярод янычараў, чорныя валасы растрапаныя, падаюць на плечы, цела пасечана, і кашуля намокла ад крыві. Яна крычыць яму, але ён ня чуе яе. Раптам яна бачыць, як над ім узьнімаецца вострае лязо шаблі. Яна прачынаецца з крыкам, пакрытая халодным потам, а наступную ноч усё паўтараецца ізноў.

Так яны праплакалі, пакуль не сьцямнела, а потым Барбара сабралася дамоў. Дамовіліся, што яны сустрэнуцца заўтра да палудня, і наведаюць абедню ў касьцёле. Барбара сышла, яна ж яшчэ прайшлася па дому, заглянула ў цокальны этаж, дзе месьціліся слугі, ды займацца гаспадаркай у яе настрою не было. Звыкла, блукаючы ў думках далёка, яна раздала даручэньні: усё павінна было быць гатова да хуткага прыезду спадара – перагледзець прыпасы, праверыць, каб было дастаткова і піцьця, і ежы, начыста вымесьці і прыбраць пакоі – у каторы раз. Ён любіў, каб усё блішчэла, усё і ўсюды было на сваіх месцах. Ніякага нядбайства не павінна было быць.

А потым, застаўшыся адна, яна запаліла сьвечы і пачала маліцца. Малілася доўга, аддана, але ж думкі яе ізноў недзе блукалі. Яна бачыла яго – ён ехаў на вялікім чорным кані ў натоўпе багата апранутых і ўзброеных ваяроў. Яна бачыла Яна: чамусьці ён плакаў, і клікаў яе. Яе сэрца стукнула, адгукнулася болем на яго боль. Аднак чорнае крыло трывогі паступова зьнікла, і цень ад яго болей не халадзіла яе. Быццам бы прыйшоўшы ў сябе, яна адчувала каленямі драўляную падлогу, і холад, які працінаў яе з вакна. Яна паўстала, каб завесіць шкляныя шыбы тоўстымі парцьерамі. Але ж толькі яна наблізілася да іх, як раздаўся нейкі громкі гук, як выбух, і пакой ярка асьвяціла каляровым полымем. Яна прынікла да вакніц, але ж не магла добра бачыць праз пакрытае інеем шкло. Унізе радасна зароў натоўп. Прагучэў яшчэ адзін выбух, і яшчэ.

Яна выцягнула засаўку, і рэзка пацягнула на сябе шыбіну. Сьнег і лёд пасыпаліся ў пакой, і яе твар абдала ледзяным паветрам. На вуліцы было чорна ад людзей, якія радасна пляскалі ў далоні і кідалі ў гару капелюшы. Раздаўся яшчэ адзін выбух, неба афарбавалася чырвоным, і раптам зь яго пасыпаліся на яе зоркі – многа яркіх, залатых і каляровых агеньчыкаў, якія

падалі прама на дахі асьвяціўшыхся ўспышкай дамоў.

- Феерверк! – ледзь ня ўскрыкнула яна, і высунулася па пояс з вакна, гледзячы на вуліцу.

- Што сьвяткуем? – крыкнула ўніз, і нехта з натоўпу адказаў ёй, радасна машучы шапкай:

- Тэўтонаў разьбілі! Сорам і ганьба крыжакам! Слава Кароне!

Раптам ёй стала радасна, так жа, як і гэтым месьцічам, якія зараз прыгалі ўнізе, топчучы брудныя гурбы сьнегу.

- Слава! – громка крыкнула яна, выдыхаючы зь лёгкіх у марознае паветра ўсю сваю боль і тугу апошніх дзён. – Слава каралю!

- Слава каралю! – падхапіў натоўп.

Яна хутка зьбегла ўніз, і расштурхала сьпяшчую служанку.

- Падымайся! Схадзі, узнай усё, што адбылося, дзе і як, і якія чуткі пра кароннае войска. Прыйдзеш, і раскажаш мне раніцой. Служанка з прасоньня ківала, а потым нацягнула сукенку, заматалася ў шаль, і выбегла на двор.

Яна лягла ў ложак, і яшчэ доўга слухала шум, выбухі – вясёлыя, не страшныя, і гул за вакном, а потым яе змарыў сон, у якім ён прыйшоў, і трымаў яе за руку.

Яна прачнулася позна ад таго, што ў пакой стукалі.

- Хто там? – запытала яна. Голас яе крыху ахрып, з-за халоднага паветра і крыку.

- Летыцыя, гэта я, Барбара! У мяне навіны! – пачулася з-за дзьвярэй – усхваляваны, узрушаны голас.

Як была, у доўгай ваўнянай кашулі, яна саскочыла з ложку, хутчэй адчыняць.

Барбара з парога кінулася ёй на шыю.

- Тэўтонаў разьбілі, малдаванаў разьбілі, войска вяртаецца! Летыцыя, войска вяртаецца! Мае сыны! Хлопчыкі мае! Яе твар быў мокрым ад сьлёзаў.

Яны ўсе, усе жывыя. І твае, і мае. Ганец быў там, і ўсіх бачыў. Яны стаяць у некалькіх днях дарогі, ужо вайшлі ў Карону. Да канца тыдня будуць тут! Круль спыніўся, прымаючы ганцоў з Вільні. Хутка, хутка мы іх убачым!

- А ведаеш, што? – раптам вымавіла яна. – Мы паедзем ім насустрач! Хочаш? Будзем сустракаць іх ля гораду! Я загадаю сабраць самы дарагі, прыгожы вазок, вялікі, і мы станем так, што нас адразу будзе бачна.

Бо ж мы сустракаем пераможцаў! Пераможцаў, чуеш?

Летыцыя ня ведала, што ёй і сказаць. Ёй хацелася і плакаць, і сьмяяцца. Раптам усё стала такім лёгкім, сьветлым і радасным.

Яна абняла Барбару, і колькісь часу яны стаялі, прыцісьнуўшыся адна да другой.

- Мы пойдзем на імшу? – запытала яна.

- Канешне, зьбірайся! Я пачакаю. Барбара лоўка разьмесьцілася ў вялікім крэсьле. Летыцыя хлопнула ў далоні, і загадала служанке:

- Прынясі нам вострага віна, зь яйкамі, і паспрытней. Гарачага. Тая пахілілася, і сышла.

Засталася толькі пакаёўка, якая дапамагла ёй апрануць цяжкое аксамітнае плацьце, запляла валасы, і прынесла таз з гарачай вадой. Летыцыя працёрла рушніком твар, і пачала наносіць на прыціраньні і краскі. Барбара між тым сыпала словамі:

- Кажуць, што малдаўскі гаспадар памірае ад сораму, а тэўтонаў віламі пакалолі хлопы. Ці чула ты такое? А яшчэ кажуць, што кароннае войска з каралём так уразіла бунтаўшчыкоў, што яны паўставалі ўздоўж дарог на калені, і малілі караля Ўладзіслава, як Пана-Бога, зьлітасьцівіцца над імі, і пасланць ім сваё благаславенне. А ў Кракаве і ў Гнезна

званы пачалі біць самі сабой. Яшчэ зь Вільні прыскакаў ганец, і кажа, што ў замку ў Троках зьявіўся дух Вітаўта. Ён быў такі раз'юшаны, што баярын, які яго ўбачыў, анямеў на палову цела.

Дух ударыў яго мячом, і выкрыкнуў: “Ганьба!”

А яшчэ зь літоўскіх лясоў павыходзілі ваўкі памерам з тура, такія вялікія, што адзін мог праглынуць чалавека! І расамаху таксама бачылі. Усё гэта – да вялікай вайны, кажа народ. Але ж я ім ня веру. Літоўцы – такія дзікуны, яны заўжды бачуць розныя істоты і нячыстую сілу. Бо ж яны ў яе вераць больш, чым у Пана-Бога.

А ты верыш у нячысцікаў і паганскіх багоў, Летыцыя? Скажы, я нікому не адкрыю. Можа, яны і сапраўды ёсьць? Ты ж там жыла, доўга. Што ты бачыла?

- Нічога асаблівага, дарагая Барбара. Летыцыя ўсьміхнулася. Але ж так, сапраўдны ў тых лясах нешта такое ёсьць. Я ня ведаю, што, ды адтуль і праўда ідзе нейкая пагроза. Лясы там цёмныя і глухія. Старая пушча, якая ніколі ня бачыла сякеры.

- А твой муж, пан Міхал, скажы, ён і сапраўды – ваўкалак? Вой, прабач, ня так сказала. Кажуць, што ён можа перакідвацца ў ваўка. Гэта так, ці не? Кажуць, што ўсе літоўцы гэта могуць. І што за гэта іх так ня любяць русіны. За паганства. Прабач, але ж такія ходзяць чуткі.

Летыцыя як раз скончыла прыпудрываць твар, і нанесла на шыю кроплю духмянага алею.

- Гэта – няпраўда, Барбара. Мой муж – самы шчыры вернік з усіх, каго я ведаю. І я ніколі ня бачыла, каб ён перакідваўся, ці ў ваўка, ці ў каго іньшага.

- Ну, так, - працягнула Барбара задумліва. – Але ж яны гэта робяць ноччу, пры поўні. Можа, ты проста не заўважала, ці гэта адбывалася сакрэтна.

- Апошні раз пры поўні мы рабілі нешта іньшае, і пан Міхал заставаўся ў чалавечым абліччы. Гэта я помню выдатна, і магу

пасьведчыць на Біблії, што ў начы ён застаецца дома, і захоўвае чалавечы воблік.

Барбара раптам рассьмяялася, а потым падышла, і абняла яе. Летыцыя ўзяла духмяны фіял, і мазнула яе руку парфюмай.

- Ружа! Як жывая! Быццам бы з саду! Я ж кажу, што вы, ліцьвіны, чараўнікі.

- Гэта мой лекар Абель, габрэй. Ён умее даставаць з ружаў іх водар і заключаць яго ў алей. Кажа, што там жыве душа ружаў. Летыцыя ўсьміхнулася, і ўстала. Хутка іх сукенкі прашапацелі па лесьвіцы, і на вуліцы зарыпелі калёсы вялікага вазку.

Глава 19: Вясельле

- Як я рада, што ты вярнуўся. Яна прыціснулася да яго – не адарваць. Далей гаварыць яна не магла, сьлёзы самі брызнулі зь яе вачэй. Ён гладзіў яе сьпіну, плечы, і яго рукі на яе целе ўздрыгвалі – ад сьлёз, якія яна ня бачыла, бо схавала твар у яго на грудзях.

Яго вусны шапталі нешта, але словы губляліся ў гуле і шуме натоўпу. – Любая мая, ня плач, я ж тут, з табою. Усё добра, я жывы, Ян жывы.

Быццам бы адказваючы на яго словы, ззаду пачуўся родны голас:

- Мама! – выкрыкнуў Іван, прабіваючыся праз натоўп. Яго рука ляжала на перавязі ля грудзей, лоўка падхопленая шаўковым чырвоным шалем. Начышчаны панцыр бліскацеў на сонцы, чорныя кудзеры хвалямі ляжалі на шырокіх плячах.

Здаецца, ніхто і не заўважыў, што малады рыцар – герой луцкае бойкі, слава аб учынке якога ляцела па ўсяму войску, у голас заве маці, як маленькае дзіця, якое доўгі час ня бачыла сваіх бацькоў.

Крэпкае кола рук вакол яе аслабла, і яна кінулася ў абдымкі другіх моцных рук, больш далікатных, дакладней – адной рукі. Другая вісела наперадзе, і ён мог толькі крыху варухнуць ею.

- Што гэта? – з жахам запытала яна. – Ты паранены? Сынок… Сьлёзы самі ліліся зь яе вачэй.

- Як жа гэта адбылося? Яе твар перакрывіў выраз болю, быццам бы толькі што яна адчула, як зламалі руку ёй.

- Гэта? Нічога, мама. Проста ўдар быў надта цяжкі, і рука ня вытрымала. Паламалася. Але ж я здолеў перахапіць меч, і я зразіў бы гэтага рыцара, але ж …

- Але ж я ўмяшаўся, і ня даў яму зрабіць гэта. Міхась усьміхнуўся. Яго вялікія рукі шырокім колам самкнуліся вакол яе і сына. – Калі б ты бачыла яго. Гектар. Ахіл. Мы былі ўражаны - не сказаць нічога.

- Ды і пан Юрша быў уражаны! Ён таксама яшчэ такога ня бачыў. Высокі сівы ваяр з доўгімі вусамі падыйшоў да іх, хлопнуў Міхася па плячу.

- Рады сустрэць тваю сям'ю, Міхал. Мае ж чакаюць мяне ў маёнтку. Прызвычаіліся, што я ўсякі раз вяртаюся з той ці іньшай бойкі.

Летыцыя ўзьняла на яго вочы – вялікія, прыўкрасныя, бліскучыя ад сьлёзаў. Раптам нешта быццам бы штурханула Якуба ў сэрца.

Такой прыгожай жанчыны ён і сапраўды ніколі ня бачыў. Значыць, гэта праўда, і ўсе чуткі пра жонку пана Міхала – толькі прыўменьшваньне яе чароўнага хараства. Яе твар быў ідэальны. Ён ня ведаў, як вызначыць гэта, бо ж ня быў ні скульптарам, ні мастаком. Ён толькі адчуваў, што яго гармонія быццам бы не належыць гэтаму сьвету. Ён быў такім прыгожым, што палохаў. Яе скура была белай, як сьнег, і, напэўна, гладкай, як шоўк. Нечакана яго накрыла зайздрасьць. Як гэта – калі рука чалавека кранае такую дасканаласьць? Што ж адчувае мужчына, прыпадаючы вуснамі да гэтага цела? Яна б нараджала ад яго кожны год, і ён бы не перастаў жадаць яе.

Раптам ён устрахнуўся, быццам бы выліў на сябе вядро халоднай вады. Жанчына глядзела на яго – прыгожая, і сапраўды. Надта. Але ж нічога незвычайнага ў ёй цяпер не было. Яе твар, вузкі, авальны, у аточаньні густых чорных косаў, ляжачых кольцамі на вісках, з доўгімі чорнымі бровамі і вялікімі падмалёванымі вачыма, з ружовымі мяккімі вуснамі, быў звычайным прыгожым жаночым тварам, які блішчэў ад толькі што пралітых сьлёзаў. Яна была слабой, і выглядала разгубленай. Маладая жанчына, тонкая, як дзіця, ростам яму па плячо, са слабымі, кволымі рукамі, вузкімі грудзямі, доўгай лебядзінай шыяй, на якой ляжалі чорныя завіткі валасоў, выступаючымі ключыцамі. Раптам ён ізноў адчуў яе цягу, гарачыню, якая быццам бы лілася з-пад яе аксамітнай сукенкі.

- Якуб. Якуб Кабылянскі, панна. Яна працягнула руку, ён крануў яе вуснамі. Лёгкая, ня маючая вагі кісьць, ад якой да яго нібыта прасьлізнула зьмейка-маланка. Гэтую жанчыну хацелася згвалціць, разарваць, а потым упасьць перад ёй на калені, і пакланяцца ёй.

- Летыцыя, - нягромка вымавілі яе вусны, і словы іх былі цягучымі, быццам мёд.

Сын і муж глядзелі на яго. Ён сабраўся з духам, і адвёў руку. Пахіліўся.

- Маё шанаваньне, панна! Рады знаёмству. Міхал, калі надумаеш, мой дом заўсёды гасьцінна адкрыты для цябе.

Міхась усьміхнуўся, і ўзьняў руку. Якуб пацiснуў яе, разьвітваючыся, і хутка адышоў, зьмяшаўшыся з натоўпам.

Яго быццам бы адпусьцілі нейкія чары. Ці – не адпусьцілі? Ён ня мог вызначыць, што зь ім робіцца. – Гэтая жанчына – і сапраўды вядзьмарка, - падумалася яму. – Ня можа звычайная сьмяротная жанчына выклікаць такія пачуцьці. Таму – пашанцавала пану Міхалу, ці не – гэта сказаць складана. Ён бы пагадзіўся, што месца гэтай красуні – у кляштары, альбо на вогнішчы. А можа, і там, і там.

- Яна яшчэ наробіць справаў, - раптам падумалася яму. Нездарма яна ўжо нарабіла іх у тых глухіх літоўскіх лясах, дзе дзеля яе абрабавалі і пажглі маёнтак. І недарма ён яе ў тых лясах хаваў, пакуль не набыў пры двары такую вагу, што спакусіцца на яго жонку было б самазабойствам, роўным пагардзе самога вялікага князя ці, нават, круля. Міхась высока ўзьняўся, ды каб не прыйшлося больна ўпасьці, - падумалася яму. На такіх высотах чалавеку часта няма чым дыхаць. Так, качаючы галавой, ён аддыйшоў, і схаваўся ў гушчары натоўпу.

- Ядзьвіга! – голас Яна абарваўся. Ён толькі што вызваліўся з абдымкаў маці, якая стаяла ля айца, прытуліўшыся да яго грудзей. Ён нахіліўся да яе, і нешта казаў – ціхае, пяшчотнае. Яе вусны ўсьміхаліся. Вочы ж Яна зацямніла прыгажосьць іншага роду. Калі Летыцыя была ноччу, таямнічым надвячоркам,

хараством восені і зімовага лесу, то прыгажосьць Ядзьвігі нагадвала вясну- сонечная, чыстая, зьзяючая. Яе тварык у аточаньні лецячых залатых кудзераў сьвяціўся, як сонца. Яна была сама чысьціня, само хараство, быццам бы анёлак, якімі упрыгожваюць унутраннае убанства сабораў. Яе чысты авальны твар быў абрамлены расчэсанымі на прабор залатымі косамі, якія яна перакінула праз плячо, бліскучымі на сінім аксаміце сукенкі. Яе подых, лёгкі, як воблачка, вырываўся з ружовага роціка парай. Уся яе тонкая постаць нагадвала ляльку, і такой тонкай таліі не было ні ў кога з кабетаў, якіх ён бачыў.

Яго рукі шчыльна ахапілі гэты тонкі стан, і вусны прыціснуліся да яе вуснаў. За дарогу ў яго адрасьлі вусы і барада – мяккія, яшчэ не густыя. Раптам ён адчуў, як жадае яе, так, што ня можа больш трываць. Яго рукі ўладна ахапілі яе сьпіну, і яна ўздрыгнула. Ён крыху адпусціў яе.

- Ты чакала мяне? – запытаў ён.

- Так, - прашаптала яна ледзь чутна. І ледзь ня вымавіла – брацік, але ж паправілася, і сказала новае для яе слова – каханы! – якое было салодкім, як мёд, на яе вуснах. Ёй хацелася паўтараць яго зноў і зноў, зноў і зноў.

Чорная цень накрыла сабор. Ці гэта толькі здаецца айцу Стэфану? Што ж такога адбылося? Звычайнае вясельле, але ж чаго так цяжка тахкае яго сэрца?

- Ганьба! Блюзьнерства нябачнае і нячутнае! Выдаць сястру за брата! Ён прыхіліўся да прахалоднай калёны, адчуваючы, як цёмныя, пякельныя цені напаўзаюць на яго. Хоць пан Міхал і паказаў яму ўсе паперы, і сьведкі асабіста прысутнічалі пры гэтым, і маладыя былі зусім не падобныя адно да аднаго, ды ўсё ж ён сумняваўся ў тым, што робіць. Чорныя вочы пана жглі яго, быццам вуглі. У гэтых ліцьвінаў заўсёды так – Вітаўт і Ягайла радніліся з цёткай і пляменьніцай з роду Гальшанскіх, Міндоўг узяў у жоны сястру сваёй памёрлай жаны, і тут яны не маглі знайсьці некага па-за межамі свайго сямейства. Стэфан быў ня ўпэўнены, што аркуш ад папежа не падроблены, але ж кашэль з грошамі прыемна адцягваў яму кішэнь. Вялікая жменя

чыстых залатых дукатаў вырашала яго сумненьні. І яшчэ пан абяцаў добрыя ахвяраваньні на патрэбы сабору.

Нарэшце, Стэфан уздыхнуў.

- Што адбылося, тое адбылося па волі і з ласкі Пана, а, значыць, гэта ўгодна яму.

Ён апусьціўся на калені перад вялікім расьпяцьцем над алтаром, і пачаў маліцца. Сьнег кружыўся, падаў за вокнамі. Набліжаліся каляды.

- Я хачу адправіць цябе ў вандроўку. Міхась склаў на грудзях вялікія рукі. Яго вочы вывучалі Івана, а Іван вывучаў яго.

- Не. Я не паеду. Ты хочаш адаслаць мяне, таму што набліжаецца вайна. Іван таксама ўпарта ссунуў бровы.

- Так. І я не хачу, каб ты загінуў у гэтых бязглуздых міжусобных бойках. Міхасю было цяжка казаць гэта. Летыцыя праплакала ўсю ноч – не жадала разьвітвацца з сынам, і, адначасова, баялася за яго.

- Ядзьвіга цяжарная. Яна народзіць у канцы жніўня. Калі вам ехаць, то ехаць зараз, пакуль дарогі яшчэ не расталі, і яна добра сябе адчувае. Бо інакш яна можа не перанесьці вандроўкі.

- Я ведаю. І таму нікуды не паеду. Я застануся тут, з табой і з маці. Калі ж мы паедзем, то ўсе разам.

- Я не магу, Ян. Я павінен застацца тут, з Жыгімонтам. Мы зьбіраем войска. Ты ж ведаеш, якія наперадзе справы. Іван нахіліў галаву.

- Ведаю, і таму я патрэбны табе тут.

- Не. Ты мне тут не патрэбны. Міхась рэзка ўстаў, і прайшоў па пакоі. – Табе гэта не патрэбна. Гэтая вайна – яна ня слаўная. Ганебная.

- Тады я падзялю з табой ганьбу, айцец. Аднак ты сам казаў,

што Сьвідрыгайлу трэба спыніць.

- Казаў, і зараз не адступлюся ад сваіх словаў. Аднак і Жыгімонт ня той чалавек … Ён ваяр, але ж не ўладар. Мяркую, што бойкі гэтыя зацягнуцца на шмат год. Я хацеў бы, каб ты перачакаў гэты час у Італіі. Там ёсьць радзіна, сваякі маёй маці. У Фларэнцыі – там моцная абшчына. Ён ледзь не сказаў – жыдоўская. Іван упарта глядзеў на яго.

- Мая маці – твая бабка, была габрэйка, - раптам вымавіў ён. - Хрышчоная габрэйка-каталічка, народжаная ад рымляніна і іўдэйскай прынцэсы высокага роду. Таксама, як і твая маці - яе айцец быў габрэям, потым ахрысьціўшымся, маці ж таксама была габрэйка па маці і напалову італьянка - па бацьку.

- Калі ты паедзеш, то я напішу аркуш. І яны прымуць вас. Там ёсьць багатая вілла, зямля. Гэты род цяпер увесь хрышчоны, так што можаш не турбавацца на гэты конт.

- Я не магу пакінуць вас, айцец. Ян апусьціўся перад ім на калені, і прыціснуў руку да вуснаў. Як ён нагадваў яму яе! Яна так жа апускалася ля яго ног, і прыціскалася да яго рукі. Ён – не ваяр, не забойца, хацелася крычаць яму. Ян, чаму ты не паслухаў мяне… Быў бы сьвятаром, мастаком, суддзёй, дыпламатам, кім заўгодна, толькі – не ваяром. Не рыцарам. Навошта табе гэта? Я, твой бацька, напіўся крыві спаўна, хопіць на некалькі пакаленьняў. Але ж вось, і сын працягвае лёс, распачаты яго айцом. Тое, што наканавана айцу, нясе і сын.

- Не. Я сказаў – не. Ты ня будзеш удзельнічаць у гэтым. Я пракляну цябе. На гэта няма маёй волі. Ён разьвярнуўся, яго твар быў страшным. - Калі хочаш, ты застанешся. Але ж твая жонка народзіць у краіне, дзе ідзе вайна. І тваё дзіцё можа ня ўбачыць нават і крышачку гэтага прыгожага сьвету.

- Паслухай, - раптам вымавіў ён. – Я не кажу, што трэба ехаць зараз. Падумай, у цябе яшчэ ёсьць час. Да калядаў, да канцу года. Але ж потым я, як бацька, загадваю цябе – едзь. Я напішу ліст у Рым, у Ватыкан. Напішу да радзіны ў Фларэнцыю, у Неапаль, у Кастылію і Арагон. Вас прадставяць пры лепшых італьянскіх і гішпанскіх дварах. Я таксама напішу ліст да

Альфонса караля Арагона. Альфонса мае пэўныя пляны на Неапаль, і ты пабудзеш пры ім. Яму таксама патрэбныя рыцары. Няма чаго табе пэцкаць рукі ў гэтых міжусобіцах, Ян. Табе трэба набыць вагу, набыць знаёмствы. А я, я потым прыеду. Я хацеў бы адправіць з табой маці, на каленях стаяў перад ёй, ды яна сказала, што лепей сьмерць, чым пакінуць мяне аднаго, і прыгразіла, што атруціць сябе, калі я вышлю яе сілай. Я малю цябе, язжай. Я далучуся. Я абяцаю, сын.

Ён нахінуўся, і ўзьняў яго. Па твару Яна беглі буйныя сьлёзы.

- Што ж. Калі ты загадваеш мне, айцец, і калі я змагу паслужыць па-рыцарску самому каралю Арагона, то я паеду.

Міхась ахапіў яго за плечы.

- Сынок, - вымавіў ён. – Ты ня ведаеш, якім лёгкім зараз стала маё сэрца. Прабач мяне. За ўсё прабач. Жыві сваім уласным розумам, сваім лёсам. Так, як і я жыў. Родны мой. У яго з вачэй беглі сьлёзы, якія ён не хаваў, і якія Ян бачыў упершыню ў жыцьці.

Дарэчы, Ян разумеў, што ня толькі вайна была прычынай, хоць яна, безумоўна, была прычынай галоўнай. Айцец хацеў адаслаць яго далей, каб сьціхла гаворка. Бо ж яго вясельле выклікала шмат плётак вакол. Нявеста доўгі час лічылася яго сястрой, хоць айцец і абвесьціў голасна аб адсутнасьці радства і нават усынаўленьня зь яго боку. І, другое. Нявеста не была цнатлівай. Да таго ж, яна была цяжарнай.

Як гэта адбылося, ён і сам не разумеў. У тую першую ноч, калі ён прыехаў дамоў, калі былі разабраныя ўсе рэчы і трафеі, і накрыты сталы, ды з’едзена і выпіта столькі, што і палічыць было нельга, калі ўсе ўзьнімалі кубкі за паход і караля Ўладзіслава, і ён быў у цэнтры ўвагі, ён выпіў у першы раз – добра так, па-рыцарску. Яму падлівалі кубак за кубкам, і бацька не забараняў. Спачатку ўсё было прыстойна, але ж потым жанчыны сышлі, і яны засталіся ў гарачай мужчынскай кампаніі. Вакол прыслужвалі напаўапранутыя служанкі, кубкі ўзьнімаліся ўсё часьцей, і шуткі сталі зусім ужо непрыстойнымі. Але ж ні на якіх прыгажунь ён глядзець ня мог. Усе яны ў

параўнаньні зь ёй выглядалі нейкімі пачварамі – громкія, вульгарныя, тоўстыя, з матляючыміся грудзямі і пышнымі задамі, не жанчыны, а нейкія зданьні, лясныя зазоўкі, што вабяць галодных да жаночага цела паляўнічых і сялян у густую чашчобу. Бацька яго размаўляў зь сівым ваяром – Якубам, да іх далучыўся і Ян Тарноўскі, і Зарэмба, які бязспынна сыпаў жартамі, і пан Анджэй – епіскап луцкі, якога голага знайшлі ля луцкага лагеру, і каго Ягайла асабіста загадаў апрануць у лепшае паходнае адзеньне, якое здолелі знайсьці, і яшчэ некалькі рыцараў, даўніх знаёмых па Грунвальдскай бойцы і па паходах супраціў асманаў. У яго ж кружылася галава, а перад вачыма стаяла яна. Спачатку яна сядзела за сталом з усімі, побач з маці, і нават выпіла крыху віна, а ён глядзеў на яе, і ня мог адвесьці вачэй. Яна была апранутая ў белае, быццам бы вясельнае плацьце з залатым поясам, які так пасаваў да яе зьзяючых валасоў, зь нізкім прамавугольным выразам, адкрываючым тонкую, ружовую ў жарка натопленым пакоі скуру. Яе шчокі і вочы гарэлі, вусны сьмяяліся. І як яна пазірала на яго! Яе жаніх, яе рыцар, які ўразіў нават бывалых ваяроў на полі бойкі! Уся яна нагадвала парцалянавую ляльку, пяшчотнага анёлка, які нейкім дзівам апынуўся за гэтым залітым віном сталом. Нарэшце, калі шуткі сталі дужа фрывольнымі, а паветра – густым, маці ўзьнялася, і яны пакінулі залу. Для яго ж яе залаты цень усё яшчэ марудзіў над сталом, як дакрананьне боскае ласкі, радуючы яго сэрца.

Таму, калі ён ужо ня мог болей трымаць і гэтае разгарачанае атачэньне, і свой жар, які запаўняў яго, ён узьняўся, і хістаючыся, выйшаў на ганак. Абцёр твар і грудзі сьнегам, і яму стала значна лепей.

Ён вярнуўся ў залу, узяў блюда, і палажыў на яго нешта салодкае, развальваючыяся кавалкі вялікага, прапітаннага сіропам і мёдам, упрыгожанага фруктамі і арэхамі торту, нейкія канфеты. Яна не дачакалася гэтай перамены, віно змарыла яе, і бацька аднес яе ў пакой на руках.

Таму цяпер у яго было апраўданьне – ён прынёс торт. Да таго ж, ён проста хацеў пажадаць дабранач.

Крыху хістаючыся, ён прайшоў у яе пакой. Яна была не адна,

але ж служанка спала ля дзьвярэй, нават пахрапвала. Зрэшты, як і заўсёды.

Ён ціха сеў ля яе ложка, паставіў блюда з тортам побач на століку. Яна спала, і ён абудзіў яе пацалункам.

- Я прынёс табе торт. Ён усьміхнуўся. - Ты ж усё праспала, соня. Калі б ты крыху затрымалася, то пабачыла б, які ён прыгожы. А так вось – толькі кавалкі. Яна пацёрлася шчакой аб яго руку.

- Люблю кавалкі, - сонна вымавіла яна. Ён узяў невялікі кавалачак, які развальваўся ў яго пальцах, і ўклаў ёй ў рот. Яна адкрыла вусны, і яго рука дакранулася да іх знутры. Яго пальцы адчулі дакрананьне яе языка, калі яна сьлізнула зь яго рукі салодкую масу. Ён нахінуўся, і выцер яе вусны сваімі, адчуваючы салодкі, духмяны смак.

- Пацалуй мяне, - раптам папрасіла яна. – Як раней. Ён рассунуў ворат яе сарочкі, і прыпаў да яе ключыцаў, і ніжэй, між яе грудзямі. А потым ня вытрымаў. Тканіна перашкаджала яму, і ён з трэскам разарваў яе, агаліўшы яе поўнасьцю. Так ён зрабіў у першыню, і яна замёрла. Заціхла, быццам бы нечага чакала.

- Усё роўна мы пажэнімся, - мільганула ў яго думка. Ён нахінуўся, і прыпаў вуснамі да яе грудзей, жывату, таліі, яму здавалася, што ўся яна – салодкая, як гэты торт. Калі б можна было, ён бы зьеў яе, разарваў бы на кавалкі, каб насалодзіцца кожнай часьцінкай яе цела. Яна ўздрыгвала ў яго руках, выгінаючыся, і адсоўваючыся ў страху.

Яна таксама разумела, што тое, што яны робяць, блага, гэта забаронена, так нельга, і гэта нельга зводзіла яе з розуму, вымушала закрываць вочы ад невядомага ёй раней пачуцьця.

- Я толькі пацалую яе, і лягу побач, - падумаў ён. – Нічога не адбудзецца. Я ўтрымаюся.

Ён сьцягнуў кашулю, зьняў ніз адзеньня, і лёг, прыціснуўшыся да яе прахалоднага тонкага цела сваім гарачым. Яго калаціла ад жаданьня.

Ён нахінуўся над ёй, і прыпаў да яе вуснаў. А потым, здаецца яна сама папрасіла, ён ня памятаваў. Яна папрасіла яго легчы на яе, так, як робяць дарослыя. Ёй было цікава. Ён мог бы ёй шмат расказаць, як і што яны робяць. Як гэта адбываецца. Але ж проста нахінуўся над ёй, і глядзеў ёй у твар. Гэты твар быў анёльскі прыгожы, тонкія павейкі яе ўздрыгвалі, галоўка запракінулася на бок. І тут ён зразумеў, што тое, што зараз узьнімаецца ў ім, значна мацнейшае за яго. Мацнейшае за ўвесь сусьвет. Ён дакрануўся да яе там, і адчуў, якая яна была вільготная. Яго плоць вырашала за яго. Здаецца, яна адсоўвалася ад яго, і яна шаптала – ня трэба, не рабі гэта. Але ж ён прыціснуў яе рукі так, як ён марыў – крыжом, быццам бы прыбіваючы яе цвікамі да гэтага ложку. І нарэшце ўвайшоў у яе, як змог. Яе ўлоньне было маленькім і шчыльным, і гэтае адчуваньне ён ня мог параўнаць ні зь якім іньшым. Ён, напэўна, згвалціў яе. Але ж ён памятаваў, як нарэшце яна ахапіла яго плечы рукамі, пакуль ён рухаўся ў ёй, выліваючыся, і разумеючы, што гэта – усё, вось ён і адбыўся, яго шлюб перад Панам Богам. Цяпер яна стала яго жонкай – адзін раз, і назаўсёды.

Хістаючыся, ён узьняўся зь яе ложку.

- Цяпер ты – мая жонка, - ціха вымавіў, і пацалаваў яе ў шчаку.

Яна нічога не адказала яму, ляжала, заплюшчыўшы вочы.

Ён устаў, і непрыкметна выйшаў з пакою. Служанка так і не прачнулася.

А раніцой маці заўважыла чырвоныя плямы на прасьціне. Ён думаў, што бацька яго заб’е, калі прачнуўся ад штуршка яго вялікай рукі. Але ж раптам нічога не адбылося.

- Што ты зрабіў? – коратка запытаў яго айцец, сеўшы на стул ля яго ложку. Ён узьняўся, і таксама сядзеў насупраць яго, трымаючыся рукамі за галаву.

- Можаш не адказваць. Сёньня я пайду ў касьцёл да айца Стэфана. І як мага хутчэй адбудзецца гэтае вясельле. На сьвята не разьлічвай. Глянуўшы на яго, бацька толькі пакачаў галавой.

- Я … я не жадаў, - нарэшце, вымавіў ён, і сам спалохаўся сваіх словаў. Раптам ён узьняў твар. – Я жадаў. Дужа жадаў. І я не адмоўлюся ад свайго слова. Яна заўсёды была маёй. Маёй жонкай. Я ведаю. Яна абяцаная мне багамі. Не гэтым богам, які вісіць на крыжы, а іньшымі. Я ведаю іх, іх галасы гучаць у цемры. Яны – тут, ува мне. Ён расьхінуў кашулю, і паказаў сабе на грудзі. Як і ў табе, айцец. Я ўзяў тое, што падарылі мне багі. І разам з гэтым я ўзяў поўную адказнасьць. Калі ж так трэба, каб воля нашых старых багоў была замацавана словам укрыжаванага Бога, то я згодны і на гэта.

- Адкуль ты ведаеш пра старых багоў? – Міхась глядзеў на яго, быццам бы бачыў яго ўпершыню.

- Адтуль жа, адкуль і ты, айцец. Бо ж твая кроў – гэта мая кроў. А значыць, што веды ў нас адзіныя. Бо ж і кроў – адзіная.

І яшчэ я ведаю, што Ядзьвіга не належыць крыжу. Яна належыць старым багам, - раптам дадаў ён. – Як і я. Як і ты. Мы заўсёды будзем належыць ім, у першую чаргу, а потым – і ўсім астатнім.

- У першую чаргу ты належыш мне, - вымавіў Міхась голасам, які быў тым больш страшным, што быў ціхім. – Належыш мне целам і душой. Я – князь, і я магу вяршыць суд на гэтай зямлі.

- Кракаў ня твой, - вымавіў Ян.

